

ПРЫТУЛАК У БЕЛАРУСІ

4

БЕЛАРУСКАЯ ШКОЛА ФРЫСТАЙЛА

8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 САКАВІКА 2022 г. АЎТОРАК № 60 (29682)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль ГУРСКІ, дырэктар Інстытута эканомікі НАН:**

*«Цана на валюту фарміруецца не з-за ўплыву попыту і прапановы і эканамічных фактараў, а пад уздзеяннем інфармацыйных укідаў, маніпуляцый з пачуццямі людзей. На жаль, некаторыя інтэрнэт-рэсурсы, заходнія СМІ працуюць на тое, каб пасеяць у людзях паніку, неспакой, штучна прымусіць іх да таго, каб хутчэй нешта купляць. Гэтыя дзеянні могуць на нейкі час істотна павысіць або панізіць курс валют або попыт на нейкія тавары. Калі будзе спакойнае, узважанае стаўленне людзей да свайго жыцця, рэсурсаў, патрэбнасцяў, то наша эканоміка не толькі вытрымае цяперашнія выпрабаванні, але і нават рэалізуе ўсе магчымасці, якія мы атрымліваем у сувязі з гэтымі падзеямі. Як бачым, эканамічная логіка падказвае, што сапраўды курс павінен змяншацца. Акрамя таго, пры ўмове пераходу ў адносінах Расіі і Беларусі на расійскія рублі пры аплаце за энерганосьбіты і беларускі рубель істотна павінен умацаваццa».*

# Час сяўбы



Фота Віктара ДРАЧОВА.

**Першымі за сяўбу бяруцца аграрыі паўднёвых рэгіёнаў краіны. У Гомельскай вобласці за ўчарашні дзень аграрыі пасеялі ранняя яравыя збожжавыя і зернебабовыя на 10,5 тысячы гектараў. Гэта амаль 10 працэнтаў ад плошчы, прадугледжанай у вобласці пад гэтыя культуры.**

**Шчыруюць на палях і ў Жыткавіцкім раёне. Трактарысты КСУП «Коленскае» Мікалай ДАМАРАД і Анатоль ПЯШЭВІЧ рыхтуюць поле пад кукурузу. А ўсяго ў гаспадарцы, якая спецыялізуецца на жывёлагадоўлі, плануюць засеяць збожжавымі і зернебабовымі амаль дзве тысячы гектараў.**

Аздараўленне

## ПАЧЫНАЕМ ПЛАНАВАЦЬ АДПАЧЫНАК

Колькі будзе каштаваць дзень у беларускім санаторыі летам, і чаму пра пуцёўкі варта думаць ужо цяпер

**Цана на пуцёўкі ў беларускіх санаторыях застаецца амаль нязменнай у параўнанні з канцом мінулага года, і на першыя месяцы лета больш як палова месцаў у нашых здраўніцах ужо забраніравана. Цікавасць да аздараўлення ў нашай краіне павялічылася, у тым ліку і з боку расіян, літаральна за два апошнія тыдні — яны актыўна цікавяцца пуцёўкамі і прыязджаюць. Чаго чакаць тым, хто збіраецца гэтым летам адпачыць у беларускім санаторыі, расказаў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.**

### ЗАПАЎНЯЛЬНАСЦЬ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

Падводзячы вынікі пачатку гэтага года, ён адзначыў, што сістэма санаторна-курортнага аздараўлення працавала стабільна і на адпачынак у санаторыях захоўваўся ўстойлівы попыт. Запаўняльнасць здраўніц павялічылася ў параўнанні з першым кварталам мінулага года і складае каля 70 %.

СТАР. 4

Усё ў парадку

## ВЕСНАВАЯ ПРЫБОРКА КРАІНЫ:

### азеляненне, юбілейныя кветнікі, уладкаванне падвалаў, капрамонт двароў



Штогод вясной мы пачынаем наводзіць парадак на зямлі: саджаць дрэвы, прыбіраць вуліцы і двары, рамантаваць сметніцы і пляцоўкі. За апошнія пяць гадоў у Беларусі высаджана ўжо больш як 3,7 млн дрэў і кустоў. А з 2019-га ў краіне штогод з'яўляецца не менш як мільён новых саджанцаў. У выніку плошча азелянення ў гарадах павялічылася больш як на тры тысячы гектараў, а ў жылых мікрараёнах — на 475,5 гектара. 118 гарадоў і райцэнтраў ужо дасягнулі патрэбнага ўзроўню азелянення (не менш як 40 % тэрыторыі ў населеных пунктах павінна быць «зялёнай»). Сёлета ў краіне з'явіцца яшчэ не менш за 360 тысяч дрэў і 114 тысяч кустоў, а з 26 сакавіка да 15 мая стартавала экалагічная акцыя «Дрэва героя», прымеркаваная да Года гістарычнай памяці, падчас якой з'явяцца новыя паркі і алеі.

СТАР. 7

КОРАТКА

- Беларуская чыгунка 31 сакавіка правядзе адзіны дзень пасажыра.
- **Новы рэзідэнт СЭЗ «Гроднаінвест» пабудуе ў Свіслачы кантэйнерны тэрмінал.**

ISSN 1990 — 763X

22060

9 771990 763008

Інтэграцыя

# АД КАМБІКОРМУ ДА КОСМАСУ

## Чаму саюзныя праграмы часам прабуксоўваюць?

**Пасяджэнне камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па эканамічнай палітыцы прайшло ў Брэсце. Такія сустрэчы праводзяцца два разы на год. Звяраюцца пазіцыі ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва па розных кірунках. Да брэсцкай размовы ў рэжыме відэасувязі далучаліся чыноўнікі, спецыялісты, вучоныя абедзвюх дзяржаў.**

Так, прадстаўнікі Міністэрства навукі і вышэйшай адукацыі Расійскай Федэрацыі разам з калегамі з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі абмеркавалі ўзгадненне праектаў канцэпцый праграм «Саюз-Біямембраны», «Кампанент-Ф», «Паскаральнік-СПР». Эксперты міністэрстваў аховы здароўя краін выверылі пазіцыі па праграмах «Новыя біямедыцынскія клетачныя прадукты і метады іх прымянення ў лячэнні сацыяльна значных і спадчынных захворванняў чалавека» (ствалавыя клеткі — 2), «Распрацоўка тэхналогій выяўлення і перадолення ўстойлівасці мікраарганізмаў да лекавых прэпаратаў для павышэння эфектыўнасці аказання персаніфікаванай медыцынскай дапамогі».



**Старшыня камісіі Парламенцкага сходу па эканамічнай палітыцы Сяргей МІЦІН** адзначыў, што за час існавання Саюзнай дзяржавы прынята каля 60 дзяржаўных праграм. Большая частка іх рэалізавана ў самых розных сферах: інфармацыйных тэхналогіях, сельскай гаспадарцы, вытворчасці матэрыялаў і прыбораў. Паводле яго меркавання, праграма — найлепшы на сёння інструмент сумеснай работы.

Летась беларускімі і расійскімі навукоўцамі ажыццяўлялася рэалізацыя чатырох навукова-тэхнічных праграм Саюзнай дзяржавы: «Развіццё сістэмы гідраметэаралагічнай бяспекі», па выніках якой функцыянуе сістэма кароткатэрміновага і звышкароткатэрміновага прагназаў небяспечных метэаралагічных з'яў, падрыхтаваны рэкамендацыі па адаптацыі галін эканомікі сумежных тэрыторый пры змене клімату. Праграма «Камбікорм-СГ» накіравана на распрацоўку інавацыйных тэхналогій для вытворчасці кармоў для рыб і пушных звяроў. Комплекс даследаванняў «ДНК-ідэнтыфікацыя» праводзіцца для прымянення ў медыцыне і крыміналістыцы, ідэнтыфікацыі асобы ў выпадку аварый, катастроф і іншых сітуацыях.

На гэты год запланаваны шэраг навукова-тэхнічных праграм, рэалізацыя якіх дазволіць узняцца на новы этап у справе асваення космасу, а таксама развіцця наземнага транспарту. Але нярэдка праграмы буксуюцца з-за павольнага працэсу ўзгадненняў. Гаворка ідзе пра бюджэтныя грошы, за расходаваннем якіх устаноўлены жорсткі кантроль. Як адзначыў **намеснік старшыні камісіі Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі Леанід БРЫЧ**, на ўзгадненні траціцца вельмі шмат часу, бывае, гэта расцягваецца на гады. З-за доўгага працэсу падрыхтоўкі, які нярэдка абумоўлены розніцай у заканадаўчых актах краін, ды і бюракратычнымі механізмамі, здараецца, зацікаўленыя суб'екты гаспадарання страчваюць цікавасць і праекты аўтаматычна пазбаўляюцца актуальнасці. Сёння трэба вызначыцца, як прыбраць гэтыя бюракратычныя бар'еры і паскорыць працэс рэалізацыі праграм.

Парламентарыі дзвюх дзяржаў усклалі кветкі да Вечнага агню ў Брэсцкай крэпасці, вызначылі месца правядзення наступнага пасяджэння камісіі — яно адбудзецца на пачатку лета ў Маскоўскай вобласці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.**



Прамая лінія

# МАГАЗІН, СОТКІ, ДАРОЖНАЯ БЯСПЕКА

## На прамой лініі старшыні Брэсцкага аблвыканкама жыхары вобласці ўзнімалі розныя надзённыя праблемы

**Гэтым разам адбыўся дыялог губернатара Юрыя ШУЛЕЙКІ з 31 жыхаром вобласці. А калі ўлічыць, што большасць званкоў мела калектыўны характар, то можна гаварыць аб праблемах, якія трэба вырашаць у многіх раёнах вобласці. Дарэчы, адну з гэтых праблем удалося вырашыць падчас прамой лініі.**



Жыхарка гарадскога пасёлка Целяханы Івацэвіцкага раёна паскардзілася на неапраўданае завышэнне цэн на соткі. Мясцовая гаспадарка даўно выдзяляе зямлю жыхарам для пасадкі бульбы. Скажам, летась такая арэнда абыходзілася ў пяць рублёў за сотку, а там, дзе зямля лепшая, — максімум 8 рублёў. Цяпер жа людзям аб'явілі, што цана паднялася да 23 і 32 рублёў адпаведна. Пры гэтым прычыну не назвалі, а перапісалі цэннік, нібы ў магазіне. «Для пенсіянера ўзяць гэтыя 10 сотак становіцца немагчыма», — даводзіла жанчына.

Кіраўнік вобласці звязаўся з кіраўніком раёна і атрымаў запэўніванне, што пытанне будзе вырашана на карысць людзей, а цэны ў гэтым годзе павышацца не будуць.

Папрасілі паспрыяць з адкрыццём крамы жыхары вёскі Белы Лясок Пружанскага раёна. Белы Лясок — вёска асаблівая, сваёй ускраінай яна ўпіраецца ў Белавежскую пушчу, там шлагбаум стаіць на ўездзе ў Нацыянальны парк. Цяпер у Белым Ляску пастаянна пражывае сотня жыхароў, а летам насельніцтва падвойваецца. Але два гады таму мясцовую краму закрылі, і два разы на тыдзень у населены пункт прыязджае аўтакрама. Вядома, людзям хочацца, каб гандлёвы аб'ект быў стацыянарны, а не на колах. Кіраўнік вобласці ў гэтым выпадку абяцаць нічога не стаў, сказаў, што трэба вывучыць сітуацыю. Магчыма, хопіць таго, што павялічыць перыядычнасць заезду аўтакрамы, а магчыма, і адкрыць магазін.

Як заўсёды, на прамой лініі цэлы шэраг пытанняў датычылася добраўпарадкавання, стану дарог. Гэтым разам людзі неаднойчы звярталіся з нагоды дарожнай бяспекі. Брастаўчанін звярнуў увагу ўлады на тое, што на шляху да аўтобуснага прыпынку па вуліцы Азёрнай няма пешаходнай дарожкі, «ляжачых паліцэйскіх» пры тым, што рух транспарту там даволі інтэнсіўны. А яшчэ людзі непакояцца там, дзе пастаянна праходзяць велікагрузныя аўтамабілі. Пра гэта гаварылі двое жыхароў Брэста. Яны жывуць у напрамку пунктаў пропуску і штодзень адчуваюць пэўныя нязручнасці. Кіраўнік вобласці падкрэсліў, што пытанні будуць вывучацца спецыялістамі кампетэнтных органаў і ўстаноў: «Бяспека людзей — перш за ўсё».

Сюды ж можна аднесці і нездавальняльны стан тратуараў па вуліцы Савецкай Канстытуцыі ў Брэсце, і недастатковае асвятленне вуліц у прыгараднай вёсцы Косічы. У кожным выпадку дадзена даручэнне мясцовым органам улады.

Кабрынчане ўзнялі даволі складаную праблему, але ж вырашаць яе давядзецца. На тэрыторыі былога ваеннага гарадка кацельную перавялі на мясцовыя віды паліва. Цяпер смурод і дым сталі пастаяннай з'явай увесь ацяпляльны сезон. «Попел асядае на будынках, дварах і машынах, дыхаць немагчыма», — казаў жыхар горада, які дазваніўся на прамую лінію. Старшыня аблвыканкама паабяцаў, што ў сітуацыі будуць разбірацца, відаць, давядзецца мадэрнізаваць кацельную, пераглядзець яе работу.

На прамую лінію пазванілі людзі з усіх рэгіёнаў вобласці. Акрамя названых вышэй пытанняў, узнімалі праблемы змянення заканадаўства. Гаворка ідзе пра магчымасць рэгістрацыі на дачных домаўладаннях. Людзі чакаюць таксама змянення тарыфаў на газ і электрычнасць. Гэта ўжо пасыл парламентарыям, каб яны не зацягвалі вырашэнне пытанняў.

**Яна СВЕТАВА.**

# ПАЧУЦЬ КОЖНАГА



**За тры гадзіны адкрытай тэлефоннай лініі са старшынёй Віцебскага аблвыканкама Аляксандрам СУБОЦІНЫМ ад жыхароў вобласці паступілі 23 званкі.**

Жыхар Віцебскага раёна звярнуў увагу на зарастанне хмызняком пустых участкаў зямлі, дзе калісьці былі збудаванні. Кіраўніцтва раёна паабяцала выехаць на месца і паглядзець магчымасць далучэння зямлі да сельскагаспадарчага абароту.

Праблему дрэннага стану дарог узнімалі жыхары Лепельскага, Сенненскага раёнаў і горада Віцебска. Вырашана правесці рамонт у красавіку, калі зямля падсохне: падсыпаць друзам, параўняць грэйдарам. Адразу два званкі паступілі наконт стану адзінай лясной дарогі да вёскі Смароднік Гарадоцкага раёна. Да пяці яе жыхароў, якім за 80 гадоў, не могуць даехаць унукі, хуткая дапамога, аўталаўка і МУС. Справа ў тым, што па адзінай дарозе тралююць драўніну лесавозы, разбіваючы каляіну. Не вырашаюць праблему ні дарожныя знакі, ні ДАІ. Губернатар узяў пытанне на асабісты кантроль.

Жыхарка Віцебска Станіслава Іванаўна звярнула ўвагу на вострую неабходнасць капітальнага рамонту шматкватэрнага дома № 27 па вуліцы Герцэна: стан каналізацыйных труб не дазваляе карыстацца вадой. Рамонтныя работы пачнуцца з красавіка, паабяцаў кіраўнік рэгіёна.

Звярталіся да старшыні аблвыканкама наконт будынка былой школы ў Пастаўскім раёне, цэн на вываз смецця ў Наваполацку, тэрытарыяльнай аддаленасці Лепельскай ЦРБ для пажылых людзей у Заслонаве, знішчэння зялёных насаджэнняў на віцебскай вуліцы Гагарына.

Наталля з Віцебска папрасіла дапамогі кіраўніцтва вобласці ў абразанні векавой асіны — яе галіны не прапускаюць святла праз вокны ў пакой маленькага сына. Пытанне вырашылі ўжо ў панядзелак.

З праблемай нерэгулярных транспартных зносін па маршруце «Талачын — Слаўнае» звярнуўся жыхар Мінска, яго бацькоўскі дом знаходзіцца ў вёсцы Маляўка Талачынскага раёна. Нягледзячы на тое што аўтобус курсіруе толькі чатыры разы на тыдзень па няцотных днях, ён часта без папярэджання проста не выходзіць на маршрут. Людзі вымушаны да дач ісці пешшу. Праблему абяцалі вырашыць. Жыхарка Віцебска Любоў Сяргееўна пацікавілася, калі з мікраёна Білева пойдзе транспарт да абласной бальніцы.

На відэасувязі з Аляксандрам Субоціным былі старшыні райвыканкамаў вобласці, што дазволіла вырашаць рэгіянальныя праблемы аператыўна.

— На прамую лінію трапляюць усякія пытанні, але часта да нас звяртаюцца грамадзяне, якія не атрымалі адказу ад мясцовай улады. Цяжэй за ўсё вырашыць праблемы асобасных узаемаадносін грамадзян, зямельныя спрэчкі. Тры гадзіны тэлефоннай лініі — своеасаблівы маркер, зрэз актуальных праблем. На дадзены момант гэта стан мясцовых, абласных, рэспубліканскіх дарог. Трэба за кожную справу брацца з душой, падыходзіць адказна, тады ва ўсіх сферах грамадства будзе парадак, — падвёў вынік Аляксандр Субоцін.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Будзьце ў курсе

# Час падатковай справаздачы

## Дэкларацыю аб даходах можна падаць нават 31 сакавіка, даслаўшы яе па пошце

**Штогод пэўныя грамадзяне нашай краіны павінны самастойна падаваць дэкларацыю аб даходах, падаткаабкладанне якіх праводзіцца не крыніцай выплаты (не падатковым агентам, не беларускай арганізацыяй). Сярод самых папулярных — даходы, атрыманыя падатковымі рэзідэнтамі Беларусі ад крыніц за межамі нашай краіны. Гэта і заработная плата, і дывідэнды ў замежных дзяржавах, працэнты па ўкладах, выйгрышы ў замежных анлайн-казіно, падарункі не ад сваякоў на буйную суму ў выглядзе грашовых пераводаў. Ёсць у нас у краіне і вядомыя сусветныя блогеры, якім трэба дэклараваць даходы. Таксама дэкларацыю павінны падаць тыя, хто атрымлівае даходы ад продажу транспартных сродкаў і нерухомай маёмасці, адзначыў начальнік Галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Андрэй КАВАЛЕЎСКІ.**

Паводле слоў спецыяліста, адразу трэба ўдакладніць, ці з'яўляецца чалавек падатковым рэзідэнтам. Падатковы рэзідэнт — фізічная асоба, якая знаходзілася на тэрыторыі Беларусі больш за 183 дні ў каляндарным годзе. «Калі ты падатковы рэзідэнт, то падаеш справаздачу па даходах, атрыманых як у Беларусі, так і за яе межамі. Калі не, то толькі па даходах, атрыманых ад беларускіх крыніц. Калі чалавек за год ні ў адной краіне не пражыў 183 дні (напрыклад, пабыў па месяцы ў кожнай), то ён прызнаецца рэзідэнтам па прынцыпе грамадзянства і павінен падаць дэкларацыю аб даходах. Калі даходы атрыманы ад замежнай арганізацыі ў выглядзе зарплаты, дывідэндаў, даходаў ад здачы маёмасці ў арэнду, працэнтаў ад укладаў па рахунках, то абкладаецца падаткам кожны зароблены за мяжой долар (ці іншая валюта). Калі за мяжой утрыманы падаходны падатак, то гэта будзе прынята ў залік у Беларусі пры прад'яўленні дакументаў, пацверджаных падатковай службай», — адзначыў Андрэй Кавалеўскі.

Заканадаўствам прадугледжана, што калі сума ўсіх падарункаў не ад сваякоў не перавысіла 7521 рубель, то падаваць дэкларацыю і плаціць падаткі не трэба. Падатак неабходна аплачваць толькі з сумы, якая перавышае гэты ўзровень. Гэта датычыцца не толькі атрымання такіх грошай з-за мяжы, але і падарункаў у межах тэрыторыі краіны.

Калі на працягу каляндарнага года асоба прадала два і больш легкавыя аўтамабілі, адзін і больш грузавы (тэхнічная маса перавышае 3 тоны), хоць бы адзін аўтобус (колькасць пасажырскіх месцаў больш за 8), то пасля рэалізацыі гэтай маёмасці неабходна аплаціць падаходны падатак праз механізм падачы дэкларацыі. Рэалізацыя кватэры, дома, зямельнага ўчастка, гаража адзін раз на пяць гадоў не абкладаецца падаткам. Прычым усе віды маёмасці разглядаюцца паасобку, гэта значыць, калі чалавек за пяць гадоў прадаў і дом, і гараж, і кватэру, дэкларацыю падаваць не патрабуецца.

Андрэй Кавалеўскі асобна заўважыў, што ў канцы сакавіка многія цікавяцца, якімі спосабамі мы зараз можам падаць падатковую дэкларацыю.

«Ёсць некалькі спосабаў падачы дэкларацыі. Першы — яе падаванне ў падатковыя органы. Дэкларацыю аб даходах можна падаць у любую падатковую інспекцыю, незалежна ад месца жыхарства і пастаноўкі на ўлік. Другі спосаб — па пошце. Форму дэкларацыі можна спампаваць на сайце Міністэрства па падатках і зборах, запоўніць на камп'ютары або ўручную, падпісаць і накіраваць па пошце. Перавага гэтага спосабу ў тым, што дэкларацыя лічыцца прадстаўленай па даце паштовага адпраўлення, а не атрымання яе падатковым органам», — зазначыў Андрэй Кавалеўскі.

Трэці і самы папулярны спосаб падачы дэкларацыі — падаванне дакументаў у электронным выглядзе. Чатыры гады таму толькі 4% грамадзян падавалі дэкларацыю ў электронным выглядзе. Летась гэты паказчык склаў 88 %.

Прадстаўнік міністэрства адзначыў, што раней можна было падключыцца да асабістага кабінета толькі пасля звароту з пашпартам у любую падатковую інспекцыю для атрымання ўліковага запісу. Зараз зарэгістравацца можна і дыстанцыйна, але толькі з дапамогай міжбанкаўскай сістэмы ідэнтыфікацыі. «Калі вы запаўняеце электронную дэкларацыю, падатковы орган дае наяўныя ў яго звесткі, і яны аўтаматычна пераносяцца ў дэкларацыю», — дадаў Андрэй Кавалеўскі.

Дэкларацыю аб даходах неабходна падаць у падатковыя органы сёлета да апошняга дня сакавіка. А заплаціць падаходны падатак, які налічаць па дэкларацыі, трэба не пазней за 1 чэрвеня гэтага года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

# Тыдзень пад знакам мокрага снегу

## Дзённая тэмпература плюс 10 градусаў — гэта ўжо відавочна мала

**Калі ў пачатку сакавіка ў нас у большасці раёнаў краіны было суха, то ў апошнія дні месяца — як прарвала. Вось і на гэтым тыдні тэрыторыя краіны будзе знаходзіцца ва ўладзе атмасферных франтоў, таму без мокрага снегу і дажджу не абыдзецца. Разам з тым тэмпературны фон будзе паніжацца. А з серады начныя мінімумы ўсё больш будуць схіляцца да адмоўных значэнняў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Падобна на тое, што вясна не вельмі спяшаецца...**



Ужо ў аўторак па поўначы ў многіх раёнах краіны, на астатняй тэрыторыі месцамі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Раніцай па паўночным усходзе на асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Месцамі будзе ўзмацненне заходняга, паўночна-заходняга ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўдзень — ад плюс 2 градусаў па поўначы да 13 цяпла па поўдні краіны.

Больш халодныя ночы стануць з'яўляцца ў нас з серады. У перадапошні дзень месяца месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай па паўночным усходзе на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 6 градусаў да 1 марозу, тэмпература ўдзень складзе ад 1 да 7 цяпла, а ў паўднёвых раёнах — плюс 10 градусаў.

У чацвер на большай частцы тэрыторыі краіны ападкі ўзмоцняцца, але ўсё ў тым жа выглядзе (мокры снег, дождж). Уначы і раніцай на асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла, праўда, па поўначы — да 7 градусаў марозу. Удзень будзе ад плюс 1 да плюс 8 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у пятніцу на большай частцы краіны прагназуюцца мокры снег і дождж. Месцамі будуць моцныя ападкі, наліпанне мокрага снегу, слабы галалёд і на асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы і раніцай месцамі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 5 да 2 цяпла, а ў дзённы час ад 1 градуса марозу да плюс 6. Па паўднёвым усходзе на 1—2 градусы цяплей.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Быць пачутымі!

# УНІКАЛЬНЫ АБ'ЕКТ ЗАПАВЕДНАЙ ПРЫРОДЫ ПАД ПАГРОЗАЙ

**Прэзідыум НАН Беларусі ад імя беларускіх вучоных накіраваў зварот аб адмене рашэння аб будаўніцтве пагранічнай агароджы ў Белавежскай пушчы ва ўрад Рэспублікі Польшча, міжнародную незалежную няўрадавую прыродаахоўную арганізацыю Greenpeace, Сусветны фонд дзікай прыроды (WWF), Міжурадавы камітэт па ахове сусветнай і прыроднай спадчыны (WHC), Міжнародны саюз па ахове прыроды і прыродных рэсурсаў (IUCN), Польскую акадэмію навук і ў Белавежскі нацыянальны парк. Пісьмо напісана на рускай, беларускай, англійскай і кітайскай мовах.**

У звароце вучоныя Беларусі заклікаюць урад Польшчы спыніць будаўніцтва пагранічнай агароджы ў Белавежскай пушчы, а таксама звяртаюцца да міжнародных арганізацый, дзейнасць якіх накіравана на ахову прыроды, прыняць тэрміновыя меры для прадухілення магчымай каласальнай шкоды прыроднаму аб'екту, які мае выключнае прыродаахоўнае значэнне.

У тэксце гаворыцца, што Белавежская пушча — унікальны аб'ект запаведнай прыроды Еўропы, які знаходзіцца пад аховай закона з пачатку XV стагоддзя. Багацце пушчы — тысячы старадаўніх дрэў, сотні відаў раслін і жывёл, у тым ліку найбольш шматлікая ў свеце папуляцыя зуброў.

Белавежская пушча ўнесена ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА і прадстаўлена ў ім як адзіны прыродны аб'ект на трансгранічнай тэрыторыі Беларусі і Польшчы.

«Узвядзенне пагранічных загарод унутры пушчы акажа велізарнае негатыўнае ўздзеянне на стан рэдкай экалагічнай сістэмы і пацягне за сабой знікненне рэдкіх і ахоўных відаў раслін і жывёл у выніку знішчэння натуральнай расліннасці і біятопаў, разбурэнне месцаў пражывання жывёльнага свету, ізаляцыю асобных мікрапапуляцый, парушэнне цэласнасці папуляцый дзікіх жывёлін, а таксама памяншэнне генетычнай разнастайнасці дзікіх жывёл», — адзначаецца ў звароце.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Свет чакае галодных бунтаў



Харчовы крызіс у самых бедных краінах свету, перш за ўсё ў Афрыцы і на Блізкім Усходзе, можа прывесці да масавых пратэстаў і хаосу. Такія прагнозы апошнім часам узнікаюць рэгулярна, у прыватнасці з боку заходніх палітыкаў.

Падзеі ва Украіне і санкцыі Захаду супраць Расіі справакавалі рост цэн на прадукты харчавання, што можа прывесці да галодных бунтаў у самых бедных краінах свету. Такі прагноз у інтэрв'ю брытанскай газеце The Guardian зрабіла генеральны дырэктар Сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА) Нгозі Аконджа-Івеала.

«Думаю, што мы мусім быць вельмі занепакоенымі. Уздзеянне цэн на прадукты харчавання і голад у гэтым і наступным гадах можа быць значным. Ежа і энергія — два самыя вялікія прадметы ў спажывецкім кошыку беднякоў ва ўсім свеце», — сказала яна.

Аконджа-Івеала нагадала, што 35 афрыканскіх краін залежаць ад харчавання, якое імпартуецца з чарнаморскага рэгіёна. На Расію і Украіну прыпадае 24 працэнты сусветных паставак пшаніцы.

### Шольц: Германія можа стаць незалежнай ад імпарту расійскіх энергарэсурсаў сёлета

Германія можа стаць незалежнай ад імпарту вугалю і нафты з Расіі ўжо сёлета, заявіў канцлер ФРГ Олаф Шольц. Раней міністр эканомікі Роберт Хабек заяўляў, што ФРГ можа адмовіцца ад расійскага газу да лета 2024 года, а ад вугалю і нафты — ужо да лета 2022-га.

Шольц таксама прызнаў, што зараз Еўрасаюз залежны ад такіх паставак. «Праўда ў тым, што мы ініцыіруем істотны эканамічны крызіс, калі гэта зробім» (калі краіны ЕС адмовяцца ад расійскіх энерганосьбітаў. — **Заўв. рэд.**), — дадаў ён.

Пасля пачатку расійскай ваеннай спецаперацыі ва Украіне і ўзмацнення жорсткасці заходніх санкцый у Еўропе актыўна сталі гучаць заклікі знізіць залежнасць ад расійскіх энергарэсурсаў. Рынак адрэагаваў на гэта рэзкім скачком — амаль да чатырох тысяч долараў за тысячу кубаметраў.

Як адзначаў віцэ-прэм'ер РФ Аляксандр Новак, нават простае абмеркаванне адмовы Еўропы ад расійскіх энерганосьбітаў негатыўнае для рынку. Паводле яго слоў, без расійскіх паставак газу ў свеце здарыцца калапс, а цэны будуць непрадказальныя.

### Будапешт папярэдзіў, што не дапусціць транзіту зброі ва Украіну

Венгрыя не дапусціць паставак зброі ва Украіну праз сваю тэрыторыю, нягледзячы на патрабаванні Уладзіміра Зяленскага, таму што гэта паставіла б пад пагрозу жыццё і бяспеку венграў, заявіў кіраўнік венгерскага МЗС Петэр Сіярта, паведамляе РІА «Навіны».

Паводле слоў Сіярта, на саміце прэм'ер-міністраў Еўрасаюза 24 сакавіка Зяленскі «паўтарыў два добра вядомыя патрабаванні ўкраінцаў: дазволіць пастаўкі зброі праз нашу краіну і адначасова спыніць купляць прыродны газ і нафту ў Расіі».

«Для нас важней за ўсё бяспека Венгрыі і венгерскага народа. Мы дзейнічаем, каб утрымаць Венгрыю ад вайны, таму не дапусцім пастаўкі зброі праз нашу тэрыторыю. Гэтыя пастаўкі адразу стануць ваеннай мэтай для знішчэння, і мы не гатовы рызыкаваць жыццём і бяспекай венграў», — напісаў Сіярта ў Facebook.

Прэм'ер-міністр краіны Віктар Орбан па выніках саміту заявіў, што санкцыі на энерганосьбіты з РФ прывядуць да запаволення і спынення венгерскай эканомікі ў найкарацейшы тэрмін, таму Будапешт выступае супраць іх.

У пачатку сакавіка парламент Венгрыі выдаў указ, які забараняе пастаўляць зброю ва Украіну з тэрыторыі краіны.

# ПАЧЫНАЕМ ПЛАНАВАЦЬ АДПАЧЫНАК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Гэта адпавядае рэкамендацыям Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні, накіраваным на тое, каб санаторыі працавалі ў рэжыме санітарна-гігіенічнага дабрабыту. У першым квартале гэтага года былі выяўлены адзінкавыя завозныя выпадкі каранавіруснай інфекцыі пры тым, што сёння запаўняльнасць складае 73 %. Гэта значыць, аднамомантна ў санаторыях знаходзіцца каля 19 тысяч адпачывальнікаў і 15 тысяч работнікаў. Сёння нашы санаторна-курортныя ўстановы з'яўляюцца дастаткова бяспечнымі месцамі знаходжання, — падкрэсліў Генадзь Балбатоўскі.

У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года рэалізацыя пуцёвак сёлета павялічылася на 10 %. На столькі ж вырасла і выручка, якая склала звыш 120 мільёнаў рублёў. На 15 % павялічыўся экспарт паслуг. А колькасць замежнікаў у беларускіх санаторыях павялічылася з 15 тысяч (за першы квартал 2021 года) да 22 тысяч (у другім квартале 2022-га). Выручка ад экспарту паслуг таксама вырасла на 14 % і складае больш за 17 мільёнаў рублёў.

— Сістэма функцыянуе стабільна і выконвае ўсе сацыяльныя праекты і дзяржпраграмы, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі.

## ПУЦЁЎКІ Ў ЛАГЕР — ДЛЯ ЎСІХ АХВОТНЫХ

На гэтым тыдні школьнікі пайшлі на вясеннія канікулы, і ўсім ахвотным дадзена магчымасць правесці іх у аздараўленчых лагерах. Каля 61 тысячы юных беларусаў гэтым скарысталіся. Рэспубліканскі цэнтр па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні выдаткаваў на гэтыя мэты каля 1,5 мільёна рублёў.

А вось летам у лагерах адпачыць плануе каля 350 тысяч школьнікаў. Папярэднія заяўкі з рэгіёнаў прааналізаваны, і попыт будзе задаволены цалкам.

## СЯРЭДНЯЯ ЦАНА ЛЕТАМ — 72 РУБЛІ Ў ДЗЕНЬ

Пуцёўкі на летні перыяд ужо цяпер актыўна прадаюцца. На чэрвень і ліпень, у прыватнасці, забраніравана 50—60 % месцаў. Таму ўсім ахвотным правесці адпачынак у беларускай здраўніцы варта пра гэта падумаць сёння. Тым больш што пакуль пуцёўкі рэалізуюцца па фіксаванай заяўленай цане.

— Ёсць цікавасць і з боку замежнікаў, — заўважае Генадзь Балбатоўскі. — За два апошнія тыдні іх колькасць павялічылася ўдвая. На сёння колькасць замежных грамадзян у нашых санаторыях (а большую частку з іх складаюць расіяне) перавышае 2200 чалавек. Напэўна, паўплывала зняцце каранавірусных абмежаванняў, хоць для аздараўлення іх і не існавала. Аднак, напэўна, для многіх гэта было фактарам стрымлівання.

Сярэдняя цана 1 ложка-дня ў двухмесным нумары складае 69 рублёў. У параўнанні са снежнем 2021 года яна вырасла ўсяго на дзясятыя долі працэнта. Паводле прагнозаў, летам у сувязі з павышаным попытам цана зменіцца на 2-3 % — да 72 рублёў у дзень.

Нагадаем, што шэраг катэгорый грамадзян маюць ільготы на аздараўленне ў беларускіх здраўніцах. Для іх пуцёўка каштуе значна танней. Іх штогод атрымліваюць каля 700—800 тысяч беларусаў. Найперш гэта дзеці (яны маюць права бясплатнага аздараўлення), таксама інваліды I-II групы і шэраг іншых катэгорый. Прэтэндаваць на частковую аплату могуць нават працоўныя грамадзяне, якія маюць хранічныя захворванні і адпаведна права на кампенсацыю аздараўлення.

## ХТО Ў ТОПЕ НАЙЛЕПШЫХ?

Сёння ў Беларусі 15 санаторыяў маюць найвышэйшую катэгорыю, а значыць, найлепшую матэрыяльна-тэхнічную базу і паслугі самай высокай якасці. Па выніках мінулагодняга конкурсу «Пазнай Беларусь», які праводзіла Міністэрства спорту і турызму сумесна з Рэспубліканскім цэнтрам па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні, найлепшымі санаторыямі сталі «Юнацтва» і «Пліса». А ўлічваючы сацыяльныя складнікі, лідарам па выніках работы ў 2021 годзе прызнаны «Радон». Каля 75 беларускіх здраўніц прапануюць спецыяльныя праграмы і дадатковыя паслугі па аднаўленні пасля каранавіруснай інфекцыі.

**Алена КРАВЕЦ.**

Спецыяльны рэпартаж

# ПЕРАКЛАД НЕ ПАТРАБУЕЦЦА

«Звязда» пабачыла, як у адной з гомельскіх здраўніц жывуць бежанцы з Украіны

**«Гэта цяпер дакладна будзе Год Беларусі!» — даведаўшыся, што да іх у «лагер» прыехала карэспандэнт беларускай газеты, просіць перадаць нізкі паклон нашаму народу Аляксандр. Ён — яхтавы капітан, марак грамадзянскага флоту з Севастопаля. Разам з некалькімі дзясяткамі «братоў і сясцёр» па неспадзяваным баявым хрышчэнні быў эвакуіраваны расійскімі вайскоўцамі з Вышгарадскага раёна Украіны ў Беларусь.**



Сустракаю Аляксандра ў фае аднаго з корпусаў гомельскай здраўніцы. Тут асобныя пакоі аддаюць бежанцам з суседняй краіны. Праўда, у самім санаторыі слова «бежанцы» ў адрас гэтых мужчын, жанчын і дзяцей не чуваць, толькі — «нашы госці». У першыя дні расійскай ваеннай аперацыі ва Украіне гэта здраўніца прыняла больш за 120 «гасцей». Цяпер тыя, хто вызначыўся з далейшым месцам знаходжання, з'язджаюць. Іншыя працягваюць жыць у санаторыі, пакуль чакаюць аднаўлення дакументаў або рашэння па статусе бежанцаў. Засяляюцца і новенькія. Таму ў фае, дзе корпаюцца людзі з пакункамі-каробкамі, дзіцячымі калясκамі, адчуваецца ўзрушаная атмасфера.

— Пасля выбуху моста праз раку Ірпень, гэта за 20 кіламетраў ад Кіева, жыхары нашага пасёлка Глебаўка Вышгарадскага раёна Кіеўскай вобласці сталі заложнікамі сітуацыі. Скончыліся прадукты, не было вады, газу, электрычнасці, — расказвае Аляксандр.

Напярэдадні спецаперацыі ён разам з жонкай прыехаў на яе малую радзіму ў Глебаўку. Хацелі навесці парадак на магілках, падрыхтаваць да вясновага сезона бацькоўскі дом.



— На кіеўскім напрамку адразу адкрылі зялёныя калідоры, і жонка мая, кіяўлянка, з'ехала, а я застаўся, каб дабірацца назад у Севастопаль. Пайшоў на блокпост, да начальніка расійскага гарнізона, які адказвае за гэты раён. Сказалі, будзе збіраццa калона. За тыдзень сабралі, і нас у Беларусь прыехала 35 чалавек, шмат дзяцей. Вельмі добра ў Беларусі прынялі, проста як родных. Вось табе і краіна, якая ў гэтым не ўдзельнічае, якую ўсюды ў Еўропе абзываюць «рэжымам», — выказвае пазіцыю севастопальскі марак на роднай для яго рускай мове.

Аляксандру ўдалося ўзяць білет з Гомеля да Масквы, адтуль — да Севастопаля. Яго кароткі аповед сведчыць: палітычныя рознагалоссі балюча ўдарылі па сям'і:

— Жонка зараз у Львове, збіраецца ў Францыю ці Германію. Нездарма кажуць, што рэвалюцыі і войны праходзяць па сем'ях, і гэта самае страшнае.

Рускі марак асякаецца. Міма праходзіць хударлявая жанчына невялікага росту. Ён прадстаўляе яе з вялікай пашанай у голасе: «Хацелі забіць людзей ці што і трапілі якраз у яе дом. Цудам-цудам выжыла. Гэтая бяда ў нашым сяле ўсіх аб'яднала». Жанчыне з «глебаўскага» зялёнага калідора прыходзіцца тлумачыць, што без камеры, што не буду здымаць і пісаць прозвішча, калі яна не захоча. Толькі калі дакранаюся да рукі, гляджу ў вочы і кажу: «Я Наташа», жанчына набліжаецца да майго твару, літаральна шэпча: «Я Оля, из Глебовки. Приехали з русийскими солдатами, с чуловиком и сыном». Яна ледзь не плача. Апранута вельмі проста. Кажа, што працавала санітаркай у шпіталі, яе дом накрыла «градамі». «Ми вижили, не поранені, а сусідку вбило, я тільки встигла її мертву витягнути», — працягвае па-ўкраінску жыхарка Глебаўкі.

Каб аказаць псіхалагічную дапамогу пасля перажытага, у гэтай гомельскай здраўніцы вядуць прыём два спецыялісты. Па такую дапамогу могуць звярнуцца і супрацоўнікі ўстановы, якія працуюць з украінцамі, дадала **намеснік дырэктара здраўніцы Алеся ГАРАХОЎСКАЯ**.

— Яны прыязджаюць у стане шоку. Слухаеш і разам перажываеш усё. Многія сваіх родных забітых паспелі толькі закруціць у анучы, нeяк прыкрыць, не змаглі пахаваць, нават развітацца, бо трэба было ратавацца самім, дзяцей ратаваць, — дзеліцца яна.

Алеся Аляксандраўна кажа, што ў корпусе для «гасцей» з Украіны імкнуцца засяляць асобна рускіх і ўкраінцаў. Пытаюся, ці былі канфлікты? Адказвае: «Не».

— Робім так на ўсякі выпадак, таму што людзі ў асноўным у посттраўматычным шоку, невядома, як могуць сябе паводзіць, — тлумачыць Алеся Гарахоўская і зазначае, што некаторыя госці просяць не чапаць іх увогуле, не звяртацца да іх і не лезці з размовамі і роспытамі.

Намеснік дырэктара карыстаецца магчымасцю правесці экскурсію па корпусе і прасачыць за нясеннем дзяжурства адказным супрацоўнікам на пасту ў фае. Дзяжурства наладжана кругласутачна. Фіксуюцца ўсе заяўкі на медыкаменты, сродкі гігіены, дзіцячае харчаванне. У корпусе асобныя пакоі адведзены пад прадукты, гігіенічныя сродкі, гуманітарную дапамогу і рэчы.

— Аказваюць дапамогу нашым гасцям з Украіны ўстановы аховы здароўя, прадпрыемствы, арганізацыі не толькі з Гомеля, але і з Рэчыцы, Светлагорска, Мінска, — падкрэслівае **начальнік аддзела маркетынгу здраўніцы Сяргей ШАРШНЁЎ**. — Нас пытаюцца, як пералічыць грошы, як дапамагчы. Мы падкрэсліваем, што найлепш аказваць дапамогу — як фінансаву, так і гуманітарную праз арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа.

Пытаюся, што за веласіпеды стаяць у фае корпуса. Аказалася, гэтыя чатыры «жалезныя кані», на дзіва, без паломак вывезлі сям'ю з дзіцем і іх сябрам з Кіеўскай вобласці. 13-гадовая Аніта пацвярджае: гэта яна з бацькамі і іх сябрам Русланам на веласіпедах пераадолела больш чым 200 кіламетраў. Руслан шукае сваю сям'ю, якая засталася ў Чарнігаве. Тры тыдні яго родныя не выходзяць на сувязь.

— Мы будаўнікі. Я з'ехаў з Чарнігава да сябра ў Кіеў: трэба было дапамагчы з заказам па рамонце, — уступае ў гутарку па-руску Руслан. — Калі ўсё гэта пачалося, пешшу падаліся да Міхайлаўкі-Рабяжоўкі, бо там чакалі жонка сябра і яго дачка Аніта. Ішлі 14 гадзін. Калі сталі заканчвацца прадукты, вырашылі, што трэба выбірацца з краіны.

Руслан з сябрамі памянялі ў мясцовых жыхароў ежу на веласіпеды. Ехалі ў Беларусь прасёлачнымі дарогамі. Прайшлі каля 30 блокпастоў, каля 25 населеных пунктаў. Начавалі ў вёсках. «Ехаць было страшна, чулі выбухі, часам людзі, калі даведваліся, што мы едзем у Беларусь, выказвалі негатыў. У Бубенцах хацелі пабіць, не далі нам начлегу, прагналі», — кажа Руслан.

Аніта на маё пытанне, ці плакала, прызнаецца: моцна плакала, калі на блокпасту ваенныя забралі тэлефон. «Я зразумела потым, што гэта не самае страшнае», — дзеліцца дзяўчынка. Цяпер Руслан і сям'я Аніты вырашаюць, куды падацца далей. Ёсць варыянты паехаць у Маскву да знаёмых ці прасіць статус бежанцаў, застацца жыць і працаваць у Беларусі.

Дазнаюся пра яшчэ адну сям'ю, якая прыехала на Гомельшчыну на абстралянай машыне з трыма дзяцьмі. Гэта Аляксей і Алёна — маладыя бацькі з вёскі Сукачы, што таксама ў Вышгарадскім раёне Кіеўскай вобласці. На руках у іх — дзве дачкі адзінаццаці і сямі гадоў і сын Федзя. Малому год і восем месяцаў, але ўжо адчуў, што такое вайна, упэўнены бацька.

— Калі былі абстрэлы, мы ў свой склеп, а там вада стаіць. Я паспеў паддон закінуць толькі. Мы на адным паддоне прастаялі: нас пяцёра плюс сяброўка з двума дзецьмі. Восем чалавек, — кажа Аляксей. — Нават Федзя маўчаў. Баявыя дзеянні, а ён маўчыць. Дзіця адчувала, што сітуацыя асаблівая. Калі ўжо без дома засталіся, жылі ў чужых падвалах — малы еў тое, што гатавалі. Гэта было дзіўна. Зараз ужо пачаў перабіраць ежу, — кажа бацька. — Калі мы перасеклі вашу граніцу, нам кажуць: «Тут не страляюць, не хвалюйцеся». Жонка заплакала, а да гэтага тры тыдні я ў яе слёз не бачыў. Крый божа такое перажыць!

Сям'я Аляксея больш чым два тыдні чакала арганізаванай эвакуацыі. У іх доме жыць было немагчыма. Звярнуліся да прадстаўніка вясковай адміністрацыі, каб пусцілі ў пакінутыя дамы, ім адмовілі. Начавалі ў суседзяў. Пажылая жанчына не вытрымала шуму ад дзяцей больш за чатыры дні. Папрасіліся да шматдзетнай сям'і: прывезлі ім прадукты і два тыдні жылі ў адной хаце 15 чалавек. Дзеці пачалі хварэць, ежа заканчвалася, эвакуацыя не пачыналася. Сям'я Алены і Аляксея разам з іншымі такімі ж бацькамі — на трох машынах 9 дзяцей і 9 дарослых — даехалі да Беларусі.

У родным сяле, не можа супакоіцца Алёна, пад наглядам суседкі засталіся іх шчаняты. У Алёны — заводчыцы шпіцаў — якраз ашчаніліся сабачкі.

— Я падзяліла вакцыну, якая была, таму што трэба было прышчапіць шчанят, каб хоць бы жылі. Прыйшла пад краму, адкрыла каробку, кажу: «Каму шчанё?» Бясплатна раздала, каб толькі выратаваць іх, — расказвае з болем пра пакінутых гадаванцаў Алена па-руску, але калі падыходзім да «прахадной» санаторыя, пераходзіць па вядомай толькі ёй прычыне на ўкраінскую.

Сям'я цяпер вырашае, ці застацца ў Беларусі, якая вельмі спадабалася, або падацца да сяброў у Польшчу ці сваякоў у Германію. Алёна і Аляксей моцна перажываюць, бо прыяцель з Украіны паведаміў, што нібыта ўжо складзены спісы тых, хто з'ехаў бежанцам у Беларусь, каб прызнаць іх ворагамі народа.

— Мы пражылі ўсё жыццё ва Украіне і жадаем туды вярнуцца. Я ратаваў сваіх дзяцей, у мяне няма палітычных мэт, я за мір проста, — з роспаччу і надзеяй у голасе кажа шматдзетная бацька з маленькім сынам на руках.

Быццам я змагу перадаць гэта вышэйшым сілам.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

XXIX МІНСКАЯ МІЖНАРОДНАЯ КНІЖНАЯ ВЫСТАВА-КІРМАШ

# «ЗВЯЗДОЎСКІЯ» КНІГІ Ў ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

## Новыя імёны, найлепшыя выданні і тэндэнцыі літаратуры: што нам паказала XXIX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш

**Яна закончыла сваю работу 27 сакавіка. На пяць дзён выставачны цэнтр «БелЭкспа» стаў пляцоўкай для сустрэч кнігавыдаўцоў, пісьменнікаў і чытачоў. Адбываліся шматлікія прэзентацыі навінак кніжнага рынку, прайшоў сімпозіум літаратараў, былі адзначаны юбілейныя даты беларускай літаратуры — 140-годдзе з дня нараджэння класікаў Якуба Коласа і Янкі Купалы. Выдавецтва «Мастацкая літаратура» адсвяткавала сваё 50-годдзе, а Нацыянальная бібліятэка Беларусі, якая адзначае 100 гадоў свайго заснавання, распавяла аб выніках дзейнасці. Не застаўся ўбаку і Выдавецкі дом «Звязда», які правёў шмат аўтограф-сесій і прэзентацый. Наша выдавецтва ахапіла ўсе ўзроставыя катэгорыі — знайсці кнігі на ўласны густ маглі як маленькія чытачы, так і дарослыя з розных прафесійных сфер. Пералічваць усе акцыі форуму прыйдзецца доўга, таму «Звязда» сабрала найбольш яскравыя моманты кніжнай выстаўкі-кірмашу. Аб выніках мерапрыемства чытайце ў нашым матэрыяле.**

### Тэндэнцыі айчыннай літаратуры

Падчас урачыстага закрыцця XXIX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу намеснік міністра інфармацыі Ігар Бузоўскі засяродзіў увагу на тым, што сёлета было выдадзена больш кніг, у тым ліку на беларускай мове, чым летась. Сярод выданняў, якія карыстаюцца найбольшым попытам у пакупнікоў, ён назваў дзіцячую, адукацыйную і навуковую літаратуру.

Безумоўна, такая тэндэнцыя не можа не радаваць. Але хацелася б, каб і мастацкая літаратура не траціла сваёй папулярнасці



ў чытачоў. Падчас прэзентацый супрацоўнікі кніжных крам адзначалі, што проза яшчэ прадаецца, а вось кнігі паэзіі амаль не карыстаюцца попытам. Аб дадзенай праблеме разважаюць і самі пісьменнікі, і кнігавыдаўцы. Спадзяёмся, што выстаўкі-кірмашы накшталт той, што адбылася ў «БелЭкспа», паспрыяюць развіццю ўсіх галін выдавецкай дзейнасці.

### Конкурс стартапаў «ЛітUP»

У рамках форуму другі год запар праводзіцца рэспубліканскі конкурс літаратурных стартапаў. Міністэрства інфармацыі і айчынныя кнігавыдавецтвы прааналізавалі вынікі мінулага «ЛітUPа», вырашылі правесці яго і сёлета. Мэта стартапа — падтрымаць маладых пісьменнікаў і дапамагчы выдавецтвам знайсці новыя імёны.

Падчас пітчынгу аўтары павінны пазнаёміць аўдыторыю з уласнай ідэяй, распавесці аб будучай кнізе як мага больш яскрава. Удзельнікі паказваюць прэзентацыі, малюнкі, зачытваюць фрагменты з рукапісаў. А некаторыя нават спяваюць песні. Такім чынам, на конкурс было пададзена больш за 200 заявак. Да фіналу дайшлі 12 аўтараў.

Выдавецкі дом «Звязда» заўсёды з радасцю прымае новых творцаў. Сёлета наша выдавецтва абрала трох аўтараў, праекты якіх убачаць свет. Гэта Міхась Пазнякоў — падчас абвяшчэння пераможцаў пісьменнік пахваліўся, што кніга прозы «Голас» будзе ў яго ажно 109-й! Надрукуюць гісторыю Марыны Петрашкевіч пра дамавіка Сеню, а таксама кнігу казак Вікторыі Карась.



Выдавецтва «Мастацкая літаратура» абрала двух пераможцаў. Галіну Пярун з аповесцю «Заказаны скідзень» — у ёй аўтарка распавядае містычную гісторыю кахання падлеткаў. А таксама рукапіс Алесі Прыходзькі «Хлюпік і яго сябар Нюня».

Выдавецтва «Беларусь» вырашыла, што дасць дарогу двум аўтарам. Гэта 15-гадовы Ілья Набздораў з кнігай «Трэйдынг і іншыя цуды», якая навучыць чытачоў зарабляць грошы не выходзячы з дому, і Наталля Адарчэнка, якая актыўна прасоўвала свае гісторыі праз «Інстаграм».

Выдавецтва «Народная асвета» адзначыла чатырох пераможцаў. Сярод іх Алена Курэк, Вікторыя Пажыток і Ірына Бараўская, якая разам са сваім мужам распрацавала выданне, што дапамагае дзеткам развіваць прасторавае мысленне. А таксама 10-гадовая Вікторыя Смалко, якая ўжо паспела выдаць адну кнігу. Гэтым разам «Народная асвета» дапаможа дзяўчынцы надрукаваць працяг гісторыі пра хлопчыка Пітэра.

### Мастацтва кнігі

У рамках выстаўкі-кірмашу былі падведзены вынікі нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі», які ладзіцца ў 61 раз. Удзел у спаборніцтве ўзялі 35 выдавецтваў нашай краіны. У склад журы ўвайшлі прадстаўнікі сфер культуры і мастацтва дзяржаўных устаноў. Узначальваў калегію рэктар Акадэміі мастацтваў Рэспублікі Беларусь, кандыдат мастацтвазнаўства Міхаіл Баразна.

Падчас урачыстага ўзнагароджання пераможцаў Ігар Бузоўскі адзначыў:

— Я ўдзячны ўсім, хто мае дачыненне да гэтай справы, — за ўзаемадзеянне з нашымі паліграфічнымі прадпрыемствамі,



з нашымі выдавецтвамі. Гэта канкурэнтнае асяроддзе, у якім здзяйсняецца пошук формы таго выяўленчага мастацтва, якое ў далейшым павінна прывесці да выдатнага, паўнавартаснага твора. Як удзельнік адбору я скажу, што працэс ацэньвання вельмі складаны — часам мы можам не пагаджацца адзін з адным. Але мы заўсёды падкрэсліваем: названыя пераможцы — гэта чарговая прыступка на шляху ўдасканалення. Вынікі гэтай работы мы сёння і бачым.

Галоўнаму пераможцу конкурсу «Мастацтва кнігі» ўручылі найвышэйшую ўзнагароду — сімвал «Залаты фаліянт» і Ганаровы дыплом імя Францыска Скарыны. Ім стала выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» за кнігу Сяргея Мусіенкі «Гордасць за Беларусь».

Кнігі Выдавецкага дома «Звязда» перамаглі ў некалькіх катэгорыях. Гэта намінацыя «Адзінства» за выданне Уладзіміра Ліхадзедава «17 Верасня. Дзень народнага адзінства». Найвышэйшая ўзнагарода дасталася «Звяздзе» і ў намінацыі «За ўклад і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны» за кнігу «Сустрэчы. Янка Купала». Найлепшым наша выдавецтва стала і ў спецыяльнай намінацыі «Садружнасць» за альбом «Подзвіг савецкага народа бессмяротны».

Зборнік твораў Алеся Бадака «Ідэальны чытач» атрымаў дыплом І-й ступені ў намінацыі «Літфармат».

Спецыяльным прызам адзначылі кнігу «Нязломны», прысвечаную жыццю спартсмена-паралімпійца Аляксея Талая. Над выданнем працавала аглядальнік газеты «Звязда» Валерыя Сяцько.

Выдавецтва «Беларусь» таксама атрымала некалькі перамог — у намінацыі «У люстэрку часу» за кнігу «Гонар маем!», якая прысвечана Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, а таксама ў намінацыі «Беларусь памятае» за выданне «Яны былі першымі». Кніга распавядае аб дэпутатах Вярхоўнага Савета БССР першага склікання. Дыпломам найвышэйшай ступені адзначылі выдавецтва і ў катэгорыі «Духоўнасць» — пераможцам стала кніга «Беларускі буквар у нацыянальнай і сусветнай прасторы». І яшчэ адна перамога — у намінацыі «Арткніга» за выданне «Літ-арт. Знакі беларускага алфавіта».

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» стала найлепшым у намінацыі «Літфармат», дыпломам вышэйшай ступені адзначылі серыю кніг «Народная бібліятэка».

«Народная асвета» перамагла адразу ў дзвюх намінацыях. Адзначаныя ў намінацыі «Навука і веды» выданні, прысвечаныя расказам аб раслінах і жывёлінах Чырвонай кнігі, а таксама ў намінацыі «Падручнік новага стагоддзя», прызнаныя найлепшымі дапаможнікамі па біялогіі на рускай і беларускай мовах для навучэнцаў 11-х класаў.

Найлепшым ілюстратарам кнігі прызналі Лізавету Пастушэнку за яе работы ў кнізе «Жоўты бусел», якая ўбачыла свет у выдавецтве «Народная асвета». А найлепшым дызайнерам стаў Міхаіл Дайлідаў за серыю кніг «Народная бібліятэка» выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Налета міжнародную выстаўку-кірмаш чакае юбілей — форум правядуць у 30-ы раз. Спадзяёмся, што кнігавыдаўцы і пісьменнікі прадставяць яшчэ больш яскравай і цікавай літаратуры. Ну а пакуль можна засведчыць: XXIX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш адпрацавала паспяхова!

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

### «ЗВЯЗДОЎСКІЯ» КНІГІ НА ВЫСТАЎЦЫ-КІРМАШЫ

На выстаўцы Выдавецкі дом «Звязда» падзяліўся з наведвальнікамі вынікамі сваёй работы за мінулы год. Былі праведзены прэзентацыі новых выданняў — Кацярына Хадасевіч-Лісавая распавяла маленькім чытачам аб кнізе казак «Сакрэты аднаго каралеўства». Адметна, што аўтар заўсёды стварае невялікае шоу, якое нязменна прыцягвае ўвагу дзяцей. Пісьменніца ператвараецца ў казачных гераінь сваіх твораў — Шахматную Каралеву і Белую Паганку. Расказваць аб кнігах дапамагаюць і лялькі, створаныя па ўласным заказе Кацярыны Хадасевіч-Лісавой.

Выдавецкі дом «Звязда» аддае вялікую ўвагу менавіта дзіцячай літаратуры — кнігі робяць невялікімі, але з яскравымі малюнкамі, каб дзецям было лягчэй успрымаць інфармацыю. Добры прыклад — новы зборнік вершаў Міхася Пазнякова «Канцэрт», выданне ўпрыгожана работамі мастачкі Дар'і Чарняўскай. Пазнаёміцца з кнігай і аўтарам можна было падчас прэзентацыі, якая адбылася ў рамках выстаўкі-кірмашу.

Не забываецца наша выдавецтва і аб аўдыторыі, якая цікавіцца мастацтвам. Так, на выстаўку завітаў знакаміты харэограф, народны артыст СССР і Беларусі Валянцін Елізар'еў. Менавіта ён стаў героем новай кнігі «Феномен Валянціна Елізар'ева». Падчас сустрэчы прыхільнікі творчасці балетмайстра атрымалі аўтографы, а таксама даведаліся аб гісторыі стварэння кнігі. На старонках біяграфічнага выдання паўсталі інтэрв'ю з сусветнымі зоркамі балета — Радзівонам Шчадрыным і Міхаілам Барышнікавым.

# ПРОДАЮТСЯ СТОЛОВАЯ и ПОГРЕБ

**ОАО «Мозырский завод железобетонных изделий № 5» (продавец) извещает о проведении 29 апреля 2022 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Мозыре по улице Чапаева, 32**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 330/С-11181**, площадью **488,7 кв. м**, назначение – здание нежилое, наименование – **столовая.** Адрес: **Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Чапаева д. 149. Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **341500000007001200** общей площадью **0,1537 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания здания столовой. Местонахождение: **Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Чапаева, д. 149** | **279 600,00** | 27960,00 |
| | **Капитальное строение с инв. № 330/С-19049**, площадью **95,6 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **погреб.** Адрес: **Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Чапаева д. 149/1. Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **341500000007001200** общей площадью **0,1537 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания здания столовой. Местонахождение: **Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Чапаева, д. 149** | **11 280,00** | 1128,00 |

**Продавец:** ОАО «Мозырский завод железобетонных изделий № 5», г. Мозырь, ул. Чапаева, 32.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (02362) 3-26-62, 8 (033) 333-41-01 – Лукашевич О.В.

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Мозырский завод железобетонных изделий № 5»):** р/с BY50 AKBB 3012 0554 9197 7330 0000 в ЦБУ № 317 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Мозырь, БИК AKBBBY2X, УНП 400083995, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 30 марта 2022 г.** по адресу: г. Мозырь, ул. Чапаева, 32, в рабочие дни с 08.00 до 12.00 и с 12.45 до 16.45.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 28 апреля 2022 г. в 16.45 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.**

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **20 (двадцати) рабочих дней** и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Мозырский завод железобетонных изделий № 5» о порядке продаже с аукциона либо без проведения аукциона недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «Мозырский завод ЖБИ № 5».

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона находятся в приемной руководителя ОАО «Мозырский завод ЖБИ № 5».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам: 8 (0236) 23-26-62 (тел./факс), 23-42-73.**

---

Центр Промышленной Оценки

- **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
- **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5, УНП 191021390. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9, УНП 100219778** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, УНП 191224638** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства, спецтехника, бывшие в употреблении**

| Лот № | Наименование | Инвентарный номер | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Полуприцеп бортовой MAZ 931010 А 2404 А-3, 2008 г. в.** | 100000041170 | **4 174,46** |
| 2 | **Грузовой специальный автокран МЗКТ-8006 КС 5479 АВ 2915-3, 1999 г. в.** | 100000040938 | **26 835,84** |

**Местонахождение:** Гомельская обл., Козенский с/с, 1, филиал «Мозырское ПХГ» ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»

**Контактные лица по осмотру:** Крупский Валерий Валерьевич – начальник цеха, тел. +375 29 624 14 29, Акулич Иван Адамович – зам. начальника цеха, тел. +375 29 149 66 41

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО Банк БелВЭБ (г. Минск), БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение 3 (три) процента** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих дней** после проведения электронных торгов

**Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия**

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | Начало торгов в 11.00 **29.04.2022**.<br>Окончание торгов в12.00 **29.04.2022**.<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **28.04.2022** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

---

# РУП «ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ»

## извещает о проведении 14.04.2022 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

**Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым номером 424385700001000060 площадью 0,1134 га (право собственности), расположенный по адресу: Гродненская обл., Новогрудский р-н, Волковичский с/с, СТ «Берёзка», д. 11. Целевое назначение: земельный участок для коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 1 270,08 бел. рубля, задаток – 127,01 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Земельный участок с кадастровым номером 623286300010000013 общей площадью 0,1024 га, расположенный по адресу: Минская обл., Логойский р-н, СТ «Надежда». Целевое назначение: земельный участок для садоводства в СТ «Надежда» (право собственности). *Земельный участок не координирован*. **Начальная цена продажи – 7 333,20 бел. рубля, задаток – 733,32 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Объект недвижимого имущества в составе: капитальное строение с инвентарным номером 602/С-14447 общей площадью 88,8 кв. м (назначение: здание одноквартирного жилого дома; наименование: жилой дом; составные части и принадлежности: кирпичный одноэтажный жилой дом А1/к с подвалом А1, жилой пристройкой – Б1/к, мансардой – А1, верандой – 1, террасой – 2, мансардой – Б1/к, уборной – 3, сараем – 4, сараем – 5, баней – 6, мансардой (6), террасой – 7, беседкой – 8, беседкой – 9) и земельного участка с кадастровым номером 624484002101000010 площадью 0,0974 га (право собственности), расположенных по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Новопольский с/с, д. Гребень. **Начальная цена продажи – 41 640,08 бел. рубля, задаток – 4 164,01 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4**. Капитальное строение с инвентарным номером 622/С-47448 общей площадью 90,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, Деревнянский с/с, аг. Деревная, ул. Мелиораторов, 6А/10. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель; наименование: здание сушилки. Составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание сушилки А1/бл. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625485802601000535 площадью 8,1055 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 14 688,00 бел. рубля, задаток – 1 468,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Капитальное строение с инвентарным номером 622/С-47447 общей площадью 577,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, Деревнянский с/с, аг. Деревная, ул. Мелиораторов, 6А/9. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель; наименование: здание пилорамы. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание пилорамы А1/к с подвалом (А1/к), навесом 1. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625485802601000535 площадью 8,1055 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 56 851,20 бел. рубля, задаток – 5 685,12 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Капитальное строение с инвентарным номером 203/С-50921 общей площадью 433,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Шумилинский р-н, г. п. Шумилино, ул. Вокзальная, 11/4. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта; наименование: здание гаража. Составные части и принадлежности: пристройка, навес. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 225855100001000409 площадью 0,5628 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 36 288,00 бел. рубля, задаток – 3 628,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 615/С-16406 общей площадью 1 830,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Червенский р-н, Рованичский с/с, аг. Рованичи, ул. Озерная, д. 2А. Назначение: здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака; наименование: административно-производственный корпус с линией розлива. Составные части и принадлежности: пристройка – литера Б2/к, мансардный этаж – литера (Б2/к), пристройка – литера В1/к, пристройка – литера Г1/бл, пристройка – литера Д1/к, пристройка – литера Е1/бл, пристройка – литера Ж1/бл, пристройка – литера И1/бл. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625882708601000141 площадью 0,3827 га (право постоянного пользования). *Является объектом ипотеки*. **Начальная цена продажи – 260 064,00 бел. рубля, задаток – 26 006,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Капитальное строение с инвентарным номером 615/С-35878 общей площадью 548,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Червенский р-н, Рованичский с/с, аг. Рованичи, ул. Озерная, д. 2Б. Назначение: здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака; наименование: цех первичной переработки и производства соков и виноматериалов. Составные части и принадлежности: пристройка – литера Б1/бл, пристройка – литера 1, пристройка – литера 2, пристройка – литера 3, пристройка – литера 4. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625882708601000002 площадью 0,1975 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 95 040,00 бел. рубля, задаток – 9 504,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Капитальное строение с инвентарным номером 322/С-19721 общей площадью 1187,9 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Рогачёвский р-н, г. Рогачёв, ул. Александра Пушкина, 67Б. Назначение: здание нежилое; наименование: пункт ТО животноводческих ферм. Составные части и принадлежности: двухэтажное кирпично-панельное здание «Пункт ТО животноводческих ферм». Расположено на земельном участке с кадастровым номером 324750100002001363 площадью 0,3031 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 164 160,00 бел. рубля, задаток – 16 416,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-166721 общей площадью 46,8 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 230/1. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: здание проходной. Составные части и принадлежности: крыльцо, кислородная, калитка, ворота, ограждение, покрытие. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000005001146 площадью 1,5234 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 104 328,00 бел. рубля, задаток – 10 432,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-223262 общей площадью 621,5 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 240А. Назначение: здание административно-хозяйственное; наименование: административное здание. Составные части и принадлежности: три пристройки, гараж, уборная, пять навесов, шесть ограждений, трое ворот, калитка, мощение. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000006000401 площадью 0,992 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 989 820,00 бел. рубля, задаток – 98 982,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-166726 общей площадью 165,5 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 240А/1. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель; наименование: здание пилорамы. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000006000401 площадью 0,992 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 20 412,00 бел. рубля, задаток – 2 041,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 13.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-166723 общей площадью 922,1 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 240А/4. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000006000401 площадью 0,992 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 326 430,00 бел. рубля, задаток – 32 643,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 14.** Объект недвижимого имущества в составе незавершенного незаконсервированного капитального строения с инвентарным номером 700/U- наружной площадью (согласно ведомости технических характеристик, составленной по состоянию на 21.01.2017) 244,0 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения) и земельного участка с кадастровым номером 724483600007000033 площадью 0,1500 га (право собственности), расположенных по адресу: Могилевская обл., Могилевский р-н, Подгорьевский с/с, СТ «Солнечное», 237А. **Начальная цена продажи – 49 320,00 бел. рубля, задаток – 4 932,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 15.** Объект недвижимого имущества в составе:

1. Жилой дом с инвентарным номером 333/С- общей площадью жилых помещений (согласно ведомости технических характеристик, составленной по состоянию на 28.09.2021) 297,4 кв. м) и примыкающие к нему хозяйственно-бытовые постройки, расположенные по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Спортивная, 14. Назначение: здание одноквартирного жилого дома. (Объект не принят в эксплуатацию.)

2. Земельный участок с кадастровым номером 322350100003004175 площадью 0,1024 га (право собственности), расположенный по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Спортивная, 14. **Начальная цена продажи – 150 113,66 бел. рубля, задаток – 15 011,37 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 14.04.2022 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов.**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (отдел по реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.

**Окончание приема заявлений – 11.04.2022 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет Организатора аукциона: р/с BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **14 апреля** 2022 года.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 378 87 02; +375 44 763 62 63.**

Жывіце ў бяспецы!

# ПАВОДКА — ПРЫКМЕТА ВЯСНЫ

## Як справіцца з «вялікай вадой» на сваім участку?

**Прыход вясны, хоць для сакавіка месяца гэта бывае нячаста, адчулі ўжо ўсе. Многія паспелі схаваць зімовую вопратку ў шафу, павыцягвалі з гаражоў і лоджый свае ровары, паспяшаліся на прыроду. Аднак не ўсе радуюцца прыходу вясны. Жыхары прыватных сядзіб, размешчаных на адхонах узгоркаў і ў нізінах, вымушаны змагацца з талай вадой, якая пагражае іх маёмасці.**

На што патрэбна звярнуць увагу гаспадарам падворкаў, а таксама якія мерапрыемствы па папярэджанні прыроднай з'явы праводзяцца ў краіне, гаварылі падчас прэс-канферэнцыі «Рэагаванне на негатыўныя наступствы вясенняй паводкі: прафілактычныя мерапрыемствы і гатоўнасць спецтэхнікі да сезона», якая адбылася ў прэс-цэнтры Дома прэсы.

Як паведаміў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аварыйна-ратавальных службаў і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анатоль БАЛЯБІН**, на дадзены момант абстаноўка характарызуецца нязначнымі маштабамі паводкі — дажджоў не было даўно. «Невялікія пад'ёмы ўзроўню вады абумоўлены паступленнем у рэчышча рэк унутрыглебавага сцёку: у асноўным за кошт раставання снежнага покрыва, — паведаміў прадстаўнік ведамства. — Спрыяльнаму праходжанню паводкі садзейнічалі таксама невялікае прамярзанне глебы, нязначныя снегазапасы. Як вынік — памяншэнне веснавога сцёку, наяўнасць зімовай адлігі і дадатнай тэмпературы ў дзённы час, адмоўнай ноччу ў перыяд актыўнага працэсу развіцця паводкі. У далейшым сітуацыю можа ўскладніць толькі выпадзенне значнай колькасці ападкаў».

На бягучы момант паводкавымі водамі затоплены чатыры гаспадарчыя пабудовы ў Петрыкаўскім раёне і адзін участак дарогі ў Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці. «Умовы жыццядзейнасці насельніцтва не парушаны, праезд па затопленым участку дарогі магчымы толькі грузавым транспартам, — удакладніў Анатоль Балябін. — Раней затапленні ліквідаваны ў 14 гаспадарчых пабудовах, на двух мастах, чатырох участках дарог у пяці раёнах Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей».

На рэках адзначаецца спад узроўню вады, паведамілі ў МНС. У найбліжэйшыя дні раставанне і разбурэнне лёду на водных сістэмах краіны працягнецца. Аднак нягледзячы на спрыяльны прагноз, падраздзяленнямі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях праводзіцца шэраг мерапрыемстваў па гатоўнасці да рэагавання, калі абстаноўка пагоршыцца.

Для ацэнкі гідраметэаралагічных умоў, што складваюцца ў басейнах рэк, спецыялісты Белгідрамета штодзённа апрацоўваюць гідраметэаралагічную інфармацыю, якая трапляе з пунктаў дзяржаўнай сеткі гідраметназіранняў Беларусі, таксама ўлічваюцца звесткі, якія паступаюць з гідралагічных пастоў сумежных дзяржаў.

— У бягучым годзе раставанне снежнага покрыва і разбурэнне лёду на рэках краіны пачалося ў больш раннія тэрміны, — паведаміла **начальнік службы гідралогіі і аграметэаралогіі Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Кацярына ІСТОМІНА**. — Гэтаму садзейнічаў павышаны тэмпературны рэжым у лютым з сярэдняй тэмпературай паветра вышэй за норму. У цяперашні час снежнае покрыва захоўваецца толькі ў вярхоўях Заходняй Дзвіны, Дняпра і Сожа, месцамі — на паўночным усходзе Беларусі. Запасы вады ў снезе блізкія да нормы і нават меншыя за яе.



### ЯК ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА ПАВОДКІ:

— пaглядзіце і вызначце, дзе можа з'явіцца вада і па якім кірунку яна можа пайсці;

— тэрыторыю дома ачысціце ад снегу і лёду;

— вызваліце дрэнажныя і сцёкавыя канаўкі ад смецця, галін, лёду, якія назапасіліся за зіму;

— пры неабходнасці пабудуйце з падручных матэрыялаў найпрасцейшыя перашкоды для вады;

— прыбярыце з падворка рэчы, якія могуць быць пашкоджаны вадой;

— у пакоях, што падтопліваюцца, не карыстайцеся электрапрыборамі, не ўключайце асвятленне.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

# ВЕСНАВАЯ ПРЫБОРКА КРАІНЫ:

## азеляненне, юбілейныя кветнікі, уладкаванне падвалаў, капрамонт двароў

### СІСТЭМЫ ПІТНОГА ВОДАЗАБЕСПЯЧЭННЯ — ПАД КАНТРОЛЬ

Навядзенне парадку на зямлі — комплекснае пытанне, якое ўключае дзейнасць па добраўпарадкаванні, азеляненні, утрыманні ў чысціні тэрыторый абласцей, раёнаў, гарадоў. Каардынуе прыборку краіны Мінпрыроды сумесна з адпаведнымі ведамствамі.

Згодна з рэспубліканскім планам па навядзенні парадку на зямлі на 2022 год, сёлета запланаваны рамонт і ўладкаванне не менш як 2258 спартыўных і дзіцячых гульнявых пляцовак на прыдамавых тэрыторыях, рамонт 1899 кантэйнерных пляцовак для збору адходаў, а таксама 13 тысяч кантэйнераў. У планах таксама — рамонт вулічна-дарожнай сеткі, уладкаванне, рэканструкцыя і рамонт газонаў; знос пустых і трухлявых дамоў; азеляненне прыдамавых і іншых тэрыторый населеных пунктаў, расказала **Кацярына НЯСЦЮК, кансультант упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыроды і аховы навакольнага асяроддзя**:

— У лістападзе 2021-га Мінпрыроды падрыхтавала дапаўненні і змены ў пастанову Саўміна аб навядзенні парадку на зямлі. У выніку тыпавы пералік мерапрыемстваў папоўніўся новымі, якія раней не праводзіліся на тэрыторыі населеных пунктаў. Прынамсі, дадалася задача па падтрыманні ў належным стане нецэнтралізаваных сістэм пітнога водазабеспячэння, якімі карыстаецца каля 1,5 млн чалавек. Праверкі паказалі, што шэраг крыніц мае неналежны тэхнічны стан, а частка — закінутыя. Гэта з'яўляецца сур'ёзным фактарам забруджвання грунтавых вод.

Стварэнне адпаведнай інфраструктуры пры ўладкаванні велапарковак — яшчэ адно новае мерапрыемства плана, якое мусіць стымуляваць насельніцтва да змяншэння выкарыстання асабістага аўтатранспарту. Гэта ў сваю чаргу паспрые змяншэнню выкідаў у паветра. Больш за 70 % ад усіх шкодных выкідаў у атмасферу прыпадае якраз на долю аўтамашын, дадала прадстаўніца Мінпрыроды.

Летась у выніку выканання рэспубліканскага плана па навядзенні парадку на зямлі было ўладкавана 4624 спартыўныя і дзіцячыя гульнявыя пляцоўкі, высаджана больш за мільён дрэў і кустоў, адрамантавана каля 2900 кантэйнерных пляцовак, устаноўлена і адрамантавана звыш 27 тысяч кантэйнераў, у тым ліку больш як 10 тысяч — для раздзельнага збору адходаў. Адрамантавана таксама больш за 4,5 тысячы $м^2$ вулічна-дарожнай сеткі, рэканструявана 354 гектары газонаў, знесена 4167 пустых і трухлявых дамоў.

### ЗЯЛЁНЫ ДВОР — РАЗАМ!

Акцыя «Зялёны двор разам!», якая скіравана на тое, каб зрабіць больш утульнымі і прыгожымі двары сталіцы, з 2019 года становіцца ўсё больш папулярнай, сцвярджае **Настасся ВАРАБ'ЁВА, намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні, санітарным утрыманні жыллёвага фонду Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі**. За тры гады ў ёй паўдзельнічала больш як дзве тысячы чалавек, іх намаганнямі азелянілася больш як тысяча ўчасткаў, высаджана 37 тысяч дрэў і 237 тысяч кустоў.

— Жыхары могуць зайсці на сайт з адпаведнай назвай, зарэгістравацца на ім і выбраць раён горада, дзе яны хацелі б азеляніць мясцовасць і ўнесці прапановы на конт гэтага. Сёлета на сайт ужо паступіла каля 70 заявак.

Спецыяліст нагадала пра нормы, якія дзейнічаюць пры пасадцы раслін і датычацца іх аддаленасці ад падземных камунікацый, аб'ектаў знешняга добраўпарадкавання (пешаходных сцежак і дваровых праездаў), фасадаў дамоў, якія трэба вытрымліваць. Каб не парушыць нарматывы, жыхарам, якія хочуць пасадзіць дрэва ці куст каля дома, трэба звярнуцца ў адпаведны ЖЭС і ўзгадніць месца пасадкі. Самастойна выдаляць кусты і дрэвы, нават калі яны перашкаджаюць жыхарам, нельга — неабходна таксама звярнуцца да камунальнікаў, якія правядуць абследаванне раслін і прымуць рашэнне адносна іх лёсу.

### ЯСЕНІ НА ПРАСПЕКТАХ, ЕЛКІ ЎЗДОЎЖ КАЛЬЦАВОЙ

Штогод «Мінскзеленбуд» распрацоўвае альбомы па кветкавым афармленні гарадоў, дадатковым азеляненні тэрыторый, планы мерапрыемстваў па абароне раслін і павышэнні жыццяздольнасці пасадак. Напрыканцы мінулага года былі распрацаваны альбомы па дадатковым азеляненні дрэвамі і кустамі, пасадкі ўжо пачаліся. Прадпрыемствы сістэмы «Мінскзеленбуд» збіраюцца сёлета высадзіць больш як 10 тысяч дрэў і звыш 55 тысяч кустоў, дадаў **Аляксандр ЕРМАЛОВІЧ, генеральны дырэктар УП «Мінскзеленбуд»**:

— Увесну акцэнт будзе зроблены на Мінскай кальцавой аўтадарозе, з'явяцца новыя кампазіцыі на ўездзе ў горад і больш за 48 тысяч кустоў на транспартных развязках. Высадзім уздоўж МКАД каля пяці тысяч елак, каб дэкаратыўны эфект ад іх быў летам і зімою. Фігурная стрыжка зялёных пасадак у горадзе таксама будзе працягнута.

На праспекце Незалежнасці ў сталіцы з'явяцца 150 ясеняў, яшчэ 400 — на праспекце Пераможцаў, — дадала **Кацярына КАРОТКІНА, кіраўнік службы па добраўпарадкаванні і ўтрыманні аб'ектаў зялёнай гаспадаркі прадпрыемства «Мінскзеленбуд»**:

— Падчас месячніка па навядзенні парадку на зямлі «Мінскзеленбуд» плануе высадзіць каля чатырох тысяч дрэў і 43 тысяч кустоў, адрамантаваць і пафарбаваць больш як дзевяць тысяч малых архітэктурных формаў, аднавіць 3,5 гектара газонаў, адрамантаваць больш як тысячу $м^2$ сцяжынак і лесвіц. Пройдуць 70 суботнікаў і 21 акцыя. 600 дрэў, прынамсі, высадзілі на гэтых выхадных.

«Мінскзеленбуд» плануе штогод павялічваць колькасць аднагадовых кветак на 25 %. Калі раней саджалі каля трох мільёнаў аднагадовых, то летась ужо 1,47 мільёна. Замест гэтага высаджваюцца шматгадовыя.

Новыя кветнікі з'явяцца на праспектах Пераможцаў і Незалежнасці. Юбілейныя кветнікі створаць да 955-годдзя Мінска, 45-годдзя Першамайскага і Маскоўскага раёнаў сталіцы. Узгадняюцца да выкарыстання новыя вазоны, у якія будуць высаджваць дрэвы, кусты і шматгадовыя кветкі. Напрыканцы красавіка з'явяцца кветкі на плошчы Перамогі і каля Стэлы, вазоны на размежавальных агароджах дарожных палос.



**Ірына СІДАРОК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Святлана ПАПОВА:

# «КОЖНЫ СПАРТСМЕН — ГЭТА БРЫЛЬЯНТ, ЯКІ ТРЭБА АПРАЦАВАЦЬ»

**Кожныя Алімпійскія гульні прыносяць спорту нешта новае: імёны, рэкорды, тэхналогіі, дысцыпліны. Нязменным застаецца адно — медалі беларускіх фрыстайлістаў на кожных Гульнях. Пачынаючы з 1998 года яны літаральна з кожнай Алімпіяды вяртаюцца з узнагародамі. Пекін гэтую традыцыю, на шчасце, не парушыў. Алімпійская чэмпіёнка 2018 года Ганна Гуськова сёлета заваявала «серабро» ў спаборніцтвах па лыжнай акрабатыцы. Нямногім фрыстайлістам у свеце такое ўдаецца. У гісторыі беларускага фрыстайла такое ўдавалася толькі Аляксею Грышыну.**
**Да «бронзы» Солт-Лэйк-Сіці 2002 года ён дадаў «золата» Ванкувера-2010.**
**У чым сакрэт такога поспеху і як далей будзе развівацца беларускі фрыстайл, «Звяздзе» расказала намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па фрыстайле Святлана ПАПОВА.**



***— Святлана Уладзіміраўна, Алімпійскія гульні — гэта кульмінацыя ўсяго алімпійскага цыкла. Якім выдаўся гэты алімпійскі цыкл для фрыстайлістаў?***

— Вельмі цяжкім і неадназначным, дакладна не такім, як усе папярэднія. Пасля Алімпійскіх гульняў у Пхёнчхане нашы спартсмены актыўна лячыліся, аднаўляліся. Станіслаў Гладчанка перанёс аперацыю на плечавым суставе. Складанасці дадалі і лагістычныя пытанні, пытанні з вакцынацыяй, адмены спаборніцтваў ды іншыя праблемы, выкліканыя пандэміяй. Мы гэта адчулі аднымі з першых. Але перад Алімпійскімі гульнямі ў Пекіне мы адпрацавалі поўны цыкл падрыхтоўкі з трэніроўкамі на вольным паветры, гарналыжнай падрыхтоўкай. Гэта дазволіла напрацаваць патрэбныя аб'ёмы і вырашыць задачы, якія перад намі стаялі. Задача была — узяць адзін-два медалі, і мы з ёю справіліся. Безумоўна, разлічвалі на камандныя спаборніцтвы, але як ёсць.

***— На Алімпійскіх гульнях спартсмены не ведалі схілу, бо не было тэставых спаборніцтваў, і да таго ж цяжкае надвор'е. Наколькі гэта ўскладніла выступленне?***

— Надвор'е нечаканасцю для нас не стала, нашы спартсмены выступалі ў розных умовах. У тым жа Пхёнчхане надвор'е таксама было няпростае. Заключны збор перад Гульнямі каманда праводзіла ў фінскай Руцы, там таксама быў моцны мароз, моцны вецер. А што датычыцца схілу, то яшчэ ўсе былі ў роўных умовах, акрамя кітайскай каманды, якая, напэўна, яго праверыла. Вядома, было б лепш, калі б была магчымасць год таму выступіць на этапе Кубка свету, прайсці тэставыя спаборніцтвы, каб разумець, якія дзеянні выконваць пры прызямленні.

***— Пасля Алімпіяды 2018 года Ганна Гуськова прапусціла два сезоны з-за траўмы, перад Пекінам у спартсменкі было мала прызавых месцаў. А на Алімпійскіх гульнях — «серабро». Раскажыце, калі ласка, як была пабудавана яе падрыхтоўка з улікам усіх умоў?***

— Ганна Гуськова заваявала «серабро» з залатым адлівам. Яна выканала самы складаны скачок у сваім арсенале. Падчас сезона разам з трэнерамі яна адпрацоўвала два тактычныя падыходы — на двайным і на трайным трамплінах. Варыяцыя паміж двума трамплінамі дазволіла ёй максімальна эфектыўна выкарыстоўваць магчымасці схілу. На Алімпійскіх гульнях яна прадэманстравала ўпэўненае выступленне на двайным трампліне ў камандных спаборніцтвах і атрымала высокую адзнаку ад суддзяў. Акрамя таго, у яе быў дадатковы дзень, каб адпрацаваць прызямленне. Усё гэта і тактычная паслядоўнасць у трэніроўках дапамаглі ў дзень індывідуальных спаборніцтваў справіцца з рэалізацыяй пастаўленых задач. Уся яе падрыхтоўка па днях, па гадзінах, па элементах была дасканала пралічана, і гэта дало свой вынік. А тую траўму Ганна пераадолела і выконвала ўсе нагрузкі ў поўным аб'ёме. Нагадаю, што кваліфікацыйны турнір быў перанесены з-за надвор'я і кваліфікацыя была адзін дзень з фіналам. Гэта не навіна для фрыстайлістаў, але гэта вельмі цяжка. Аднак Ганна змагла мабілізавацца і ў адзін дзень прайсці ўвесь шлях да медаля.

***— Ганна Дзяруга і Настасся Андрыянава ўпершыню выступалі на Алімпійскіх гульнях. Што вы можаце сказаць пра выступленне гэтых спартсменак?***

— Ганна і Настасся — спартсменкі юніёрскага ўзросту. І вельмі добра, што яны змаглі адабрацца на Алімпійскія гульні. Настасся заняла 12-е месца. З ёй былі падрыхтаваны тры скачкі на двайным трампліне. У фінал яе вывеў найскладанейшы скачок у яе арсенале. Ёй толькі 17 гадоў, і пакуль узрост не дазваляе выконваць больш складаныя скачкі, для гэтага патрэбныя час, база. Тое ж самае датычыцца і Ганны. На працягу сезона ад старту да старту яна паказвала прагрэс, на этапе Кубка свету ў ЗША заняла шостае месца ў фінале, гэта добры вынік. Аднак на Алімпійскіх гульнях яна не змагла справіцца з хваляваннем і эмоцыямі, што прывяло да няўпэўненага выступлення. Алімпійскія гульні — гэта зусім іншы старт з вялікай адказнасцю. І спартсмену вельмі важна з гэтым справяцца. Для Ганны гэта быў першы сезон у Кубку свету і атрыманы вопыт у будучым трансфармуецца ў вынік. Былі, вядома, і тактычныя памылкі. Але асноўную ролю адыгралі хваляванне і недахоп вопыту. Ганне і Настассі трэба было набрацца вопыту. А нам трэба было паказаць, што ў нас ёсць моладзь, на якую мы разлічваем.

***— На жаль, без узнагарод засталася мужчынская частка каманды. На ваш погляд, у чым прычына?***

— Сапраўды так, хлопцы не ўвайшлі ў лік прызёраў. Станіслаў Гладчанка ў фінале заняў 11-е месца. У камандных спаборніцтвах ён дапусціў памылку перад прызямленнем, што прывяло да значных выніковых убавак. Паколькі камандны турнір праходзіў упершыню ў алімпійскай праграме, гэта дадало хвалявання, што і прывяло да памылкі. Да індывідуальнага турніру Станіслаў падышоў у поўнай баявой гатоўнасці. У яго арсенале была праграма з двух варыянтаў двайнога сальта з чатырма піруэтамі, а таксама магчымасць ускладнення праз выкананне трайнога сальта з пяццю піруэтамі. Аднак суддзі выставілі празмерна строгія адзнакі, якіх было недастаткова для выхаду ў суперфінал. Станіслаў дэманстраваў упэўненыя скачкі і прэтэндаваў на месца вышэй за выніковае. Але суб'ектыўнае ўспрыманне спорту ўносіць свае карэктывы.

***— А Павел Дзік і Максім Гусцік?***

— Максім Гусцік заняў выніковае 20-е месца ў індывідуальных спаборніцтвах. У яго арсенале была праграма трайнога сальта з чатырма піруэтамі. Аднак назапашвальны эфект ад тэхнічных памылак за час спартыўнай кар'еры не дазволіў атрымаць высокія адзнакі на Алімпійскіх гульнях. Максім паказаў самы складаны скачок, але запасу трываласці не хапіла для канкурэнтнай барацьбы. Гэта ўсё памылкі, якія ён назапасіў за сваю шматгадовую спартыўную кар'еру, суддзі на іх глядзяць ужо па-іншаму. Павел Дзік заняў 22-е месца ў індывідуальных спаборніцтвах. У яго добрая праграма з двума варыянтамі трайнога сальта з чатырма піруэтамі. Для Паўла гэта першы вопыт удзелу ў спаборніцтвах такога ўзроўню. Залішняе хваляванне і псіхалагічная нагрузка не дазволілі тактычна падысці да выканання элементаў, што пацягнула за сабой шэраг памылак.




***— Вы кажаце, што на выступленні паўплывалі хваляванне і псіхалагічная нагрузка. Можа, варта ўключыць у падрыхтоўку спартсменаў і работу з псіхолагам?***

— У камандзе ёсць трэнер-масажыст, які мае псіхалагічную адукацыю. Ён працуе са спартсменамі. Але ў фрыстайле самае галоўнае і самае важнае — гэта ўзаемадзеянне трэнера і спартсмена. Від спорту дастаткова экстрэмальны. Поўнае разуменне і давер паміж трэнерам і спартсменам прывядзе да пэўных вынікаў. У нас сапраўды каманда, усе стаяць гарой адзін за аднаго. І як такая, наяўнасць псіхолага, магчыма, і не зусім неабходная. Агульнае паразуменне трансфармуецца ў добры псіхалагічны клімат унутры камандаў, які сам па сабе прыводзіць да станоўчага выніку. Мы кіруемся гэтым.

***— З аднаго боку, камандныя спаборніцтвы на Алімпійскіх гульнях — гэта добра, дадатковы шанц на медаль. З іншага боку, гэта ўплывае на псіхалагічны настрой спартсменаў...***



Извещение опубликовано на сайте http://www.gki.gov.by/ru и https://bsk.by.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-159329, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, ш. Озерское, 16в, площадь – 14,2 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание проходной.**
Лот № 1, расположен на земельном участке, кадастровый № 440000 001006833, находящемся по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, ш. Озерское, 16в, площадью 0,0146 га назначение – земельный участок для обслуживания здания проходной

Начальная цена продажи – 4 500 руб. (четыре тысячи пятьсот рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 450 руб. (четыреста пятьдесят рублей)

Продавец – Гродненский городской филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 8-0152-52-02-88

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия проведения аукциона:
- оплата за приобретаемый объект производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь;
- расходы по государственной регистраций договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя;
- право собственности переходит к покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистраций и земельному кадастру»;
- документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи.

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 29 апреля 2022 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 27 апреля 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

**Открытое акционерное общество**
**«Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»**
*(Республика Беларусь, 246008, г. Гомель, ул. Лещинская, 49)*
сообщает, что годовым общим собранием акционеров данного общества, состоявшимся 24.03.2022,
принято решение о выплате дивидендов по итогам 2021 года –
0 рублей 55 копеек на одну простую (обыкновенную) акцию.

Выплата дивидендов по акциям будет производиться с 28.03.2022 по 31.12.2022. Порядок выплаты дивидендов акционерам: юридическим лицам – путем зачисления на их расчетные счета, физическим лицам дивиденды выплачиваются через кассу ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» или высылаются почтовым переводом (в пределах Республики Беларусь).

УНП 400078768

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 14 апреля 2022 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)*** |
|---|
| Нефтепродукт – обводненное (с примесями) сырье для производства нефтяных вязких дорожных битумов в количестве 400 тонн (ориентировочно), содержащийся в битумохранилище, расположенном по адресу: Минская область, Слуцкий район, Козловичский с/с, д. Великая Слива, АБЗ-2 |
| Начальная цена: 49 600,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 4 900,00 бел. руб. |

** Покупатель обязуется своими силами, средствами и за свой счет произвести вскрытие битумохранилища, выемку содержимого (продаваемого имущества) и вывоз с территории производственной базы. Окончательное количество продаваемого имущества определяется по мере выборки нефтепродукта с учетом его контрольного взвешивания.*

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **14 апреля 2022 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 29.03.2022 по 12.04.2022 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона)**
информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
**РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» (Продавец)**
на праве хозяйственного ведения

**Лот № 1:** Машина фотокопировальная BIZHUB PRO C6000L Konica Minolta, инв. № 1600. Начальная цена с НДС – 3 544,12 руб.
**Лот № 2:** Машина трафаретной печати RISO EZ 371 A3, инв. № 1599.
Начальная цена с НДС – 4 041,98 руб.
**Лот № 3:** Переплетная машина ручная MetalBind MB 300, инв. № 1598.
Начальная цена с НДС – 1 313,39 руб.
**Лот № 4:** Термоклеевой аппарат BW-M40, инв. № 2922.
Начальная цена с НДС – 3 832,58 руб.
**Лот № 5:** Автоматическая биговальная машина с ручной подачей SABTEC CR-370, инв. № 2921. Начальная цена с НДС – 7 386,10 руб.
**Лот № 6:** Пресс для тиснения фольгой OPUS Masterpress 01, инв. № 1634.
Начальная цена с НДС – 4 733,10 руб.
**Лот № 7:** Резак гильотинного типа IDEAL 4705, инв. № 1603.
Начальная цена с НДС – 2 967,06 руб.
**Лот № 8, состав:** 1. Ламинатор рулонный Excelam-II 355Q, инв. № 1607, 2. Биговщик Cyklos GPM 320 f (CYGPM320), инв. № 1620, 3. Степлер электрический 106E Rapid, инв. № 1602, 4. Перфобиндер для переплета на металлических пружинах RENZ SRW 360, инв. № 1601. Начальная цена с НДС – 1 085,84 руб.
**Местонахождение Лотов №№ 1–8:** г. Минск, ул. Папанина, 7.
Аукцион состоится **29.04.2022 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.
Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by** и Организатора аукциона **ino.by.**

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

# НАШЧАДКІ МАГДЭБУРГСКАГА ПРАВА

## 955 гадоў першай летапіснай згадцы пра Мінск

**Ужо стала добрай традыцыяй кожную вясну збіраць у ратушы даследчыкаў, якія дзеляцца сакрэтамі з мінулага жыцця горада. У Год гістарычнай памяці абмяркоўваліся пытанні, звязаныя пераважна з гісторыяй Мінска ў XVII—XVIII стагоддзях падчас дзеяння на беларускіх землях Магдэбургскага права.**

Так, **навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі Надзея ПАЛТАРЖЫЦКАЯ** распавядала пра ўнікальныя старажытныя крыніцы — магістрацкія кнігі, па якіх можна рэканструяваць гісторыю. Уласна, гэта збор дакументаў па фінансавых здзелках, продажы ці дарэнні маёмасці, тастаменты (так называлі завяшчанне). Таксама магістрацкія кнігі, якіх захавалася няшмат, дазваляюць даведацца больш, якой была гарадская ўлада ў старажытным Менску (менавіта такая назва зафіксавана ў старых паперах). Так, па школьных падручніках мы вывучалі, што магістрат складалі рада і лава, але з дакументаў другой паловы XVII стагоддзя вынікае, што такога падзелу на той час ужо не было. Войт быў прадстаўніком княжацкай улады, у горадзе з'яўляўся не так часта. Пытанні кіравання горадам вырашалі бурмістр, прадстаўнікі мяшчан, быў і інстытут так званых мужоў гмінных. Таму і помнік, які сёння стаіць каля ратушы, усё ж лепш было рабіць не войту, а бурмістру. Тым больш часта сярод такіх кіраўнікоў былі асобы яскравыя, харызматычныя, нават гатовыя пацягаць за бараду тых, з кім не пагаджаліся.

Часцей у панядзелак, чацвер і суботу вырашаліся судовыя справы, а ў аўторак, чацвер альбо ў іншы дзень, калі разбор не цярпеў адкладу, — пытанні, якія датычыліся кіравання горадам. Ладзіліся справы і для гасцей (у той час так называлі чалавека, які ехаў у горад для вырашэння сваёй справы і пры гэтым на дарогу патраціў больш чым адзін дзень). Акрамя таго, пры неабходнасці склікаліся сесіі ў любы дзень, калі трэба было па гарачых слядах раскрываць злачынствы. Першага студзеня збіраліся агульныя пасяджэнні старой і новай рады.

У 1831 годзе Мікалаем І Магдэбургскае права ў горадзе было адменена. А ў 1892 годзе было ўведзена гарадское кіраванне. Выбіраліся гарадская дума (якая зацвярджала гарадскі бюджэт), управа і гарадскі галава. У выбарах па Мінску браў удзел не больш за адзін працэнт гараджан (пры гэтым на канец XIX стагоддзя насельніцтва Мінска было каля 100 тысяч чалавек). Але гэта былі найбольш багатыя, адукаваныя і, адпаведна, зацікаўленыя ў развіцці тэрыторыі асобы.

Каб мець гарадское выбарчае права, трэба было праходзіць маёмасны цэнз (быць гаспадаром уласнага ці даходнага дома, сядзібы ці прадпрыемства). Натуральна, чалавек, які меў бізнес, мог мець дачыненне і да гарадскіх спраў. Гаспадарам дамоў і прадпрыемстваў было важна, каб вуліцы брукаваліся, развівалася камунальная гаспадарка, былі асвятленне, вадаправод. Дарэчы, ужо ў той час меліся лічыльнікі — колькасць спажытай вады лічылася ў вёдрах. Даходы з электрастанцыі ішлі ў гарадскі бюджэт. Рашэнне аб тым, што ў Мінску павінен быць грамадскі транспарт (конка), вырашала сама гарадская дума. На мяжы XIX—XX стагоддзя ў гарадскі бюджэт паступалі падаткі за нерухомасць, зборы з гандлёвых здзелак. Існавалі і ўнутраныя гарадскія падаткі — адзін з іх быў, напрыклад, з гаспадароў сабак, другі — з тых, хто валодаў конямі. Былі зборы і з уладальнікаў ровараў (на апошнія нават змяшчалі нумарныя знакі). Вялікія даходы прыносілі камунальныя прадпрыемствы.

Часам у гісторыі можна шукаць падказкі. Спецыяліст па гістарычнай урбаністыцы, пастаянны ўдзельнік сустрэч у ратушы Андрэй Кіштымаў упэўнены, што Магдэбургскае права значна паўплывала на далейшае развіццё нашых тэрыторый. Менавіта з ім звязаны выразны падзел на сялян і гараджан, калі статус апошніх пачаў лічыцца прэстыжным. І цяга людзей да гарадоў, якая і сёння выяўляецца ва ўрбанізацыі, паходзіць менавіта з тых часоў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Этнаскарбонка

# ДЗЕ ЗНАЙСЦІ ЧАРАВІЧКІ СВІЦЯЗЯНКІ?

**Усё пачыналася з бясконцых паездак па вёсках, пошукаў, знаёмстваў, адкрыццяў, уражанняў. Пасля прыняцця ў канцы 1990-х — пачатку 2000-х пастановы аб стварэнні дамоў рамёстваў і падтрымцы народнай творчасці пачалася карпатлівая работа па збіранні звестак пра майстроў, якія яшчэ памятаюць народныя традыцыі і могуць падзяліцца сакрэтамі, што пераймалі ад сваіх продкаў. Стаяла няпростая задача: захаваць і адрадзіць вялікі пласт народнай культуры. Пасля разрухі 1990-х здавалася, што выканаць яе будзе цяжка. Метадыст Навагрудскага Цэнтра рамёстваў Вольга ЮШКЕВІЧ, якая была першаадкрывальніцай у дадзенай справе па раёне, згадвае:**

— У той час ужо не працавалі ткацкія станкі. Майстроў іхнія ж суседзі звалі «дзівакамі», маглі ўшчуваць, маўляў: «Сядзіць, лайдак, кошыкі пляце. Лепш бы справай заняўся»... А мы адкрывалі незвычайных асоб, якіх Гасподзь узнагародзіў талентам. Гэта сапраўдная скарбніца.

Была зроблена карта рамёстваў па сельскіх Саветах, на якой пазначалася, дзе што захавалася. Сабрана багатая калекцыя народных вырабаў (некаторым з іх пад сотню гадоў), «падгледжаны» тэхнікі і ідэі. Сталі ладзіцца святы рамёстваў. Аднаўляюцца ўзоры са старых навагрудскіх паясоў, ствараюцца традыцыйныя строі. Рабіліся запісы па фальклоры, традыцыях раёна. Нават навагрудская кухня была «раскручана» дзякуючы майстрам — яны ўпаміналі, якія стравы былі ў іх сем'ях. Так дзякуючы рамёствам захоўваецца гістарычная памяць пра даўнейшае жыццё рэгіёна.

## Пад крыламі анёла

На Навагрудчыне можна пачуць легенду пра Свіцязянку — панначку, якая ад свайго каханага атрымала ў падарунак чаравічкі. Перад расстаннем (хлопца адпраўлялі ў рэкруты) маладыя пакляліся назаўсёды захаваць сваё каханне. Калі дзяўчыну сілком хацелі выдаць замуж за нялюбага, кінулася яна ў Свіцязь, ператварылася ў русалку. Праз пэўны час юнак вярнуўся з рэкрутаў, убачыў, як з возера выходзіць прыгажуня, аслупянеў, пагадзіўся стаць яе нарачоным. Толькі раптам чараўніца абярнулася паненкай, што трымала ў руках яго падарунак — чаравічкі, і папракнула, што не стрымаў хлопец слова, не застаўся верным свайму каханню... А яшчэ легенду можна звезці з сабой. Майстры з навагрудскага Цэнтра рамёстваў перадаюць яе праз карціны, пано, робяць лялькі і саламяныя туфлікі Свіцязянкі. Апошнія ўжо сталі брэндавым сувенірам раёна. Аўтар ідэі — загадчык Навагрудскага раённага Цэнтра рамёстваў Святлана Кулак. Пад яе рукамі з саломкі выходзяць сапраўдныя цуды — на пано ўзнікаюць дзівосныя кветкі, Навагрудскі замак, храмы.

Дзякуючы творцам ажываюць чароўныя сюжэты, вяртаюцца старажытныя ўзоры, захоўваюцца і аднаўляюцца традыцыі продкаў. Кожная лялька, ручнічок — напамін пра прыгажосць роднай зямлі, пра тое, што побач жывуць таленавітыя людзі і што хараство можна ствараць сваімі рукамі і трэба несці ў сэрцы. У Цэнтры рамёстваў можна сустрэць казачных і калядных персанажаў, анёла-ахоўніка Навагрудка. У сучасных вырабах закладваюцца старадаўнія ідэі, пажаданне добрай долі роднай зямлі.

## Рукі майстра

Сёння перад майстрамі Цэнтра стаіць задача сабраць уласныя калекцыі. Гэта ўжо будзе аповед пра сучасную гісторыю раёна. Не трэба думаць, што цэнтры рамёстваў займаюцца толькі захаваннем старога — тут нараджаецца і новае мастацтва. Работа рамеснікаў ускладняецца.

— Сёння людзі перанасычаны тым, што было. Яны пастаянна бачаць прыгожыя малюнкі ў інтэрнэце. Каб іх уразіць, трэба шукаць новае. Ненавіджу злізванне з інтэрнэту, — прызнаецца майстар саломапляцення Вольга Юшкевіч. — Кожная работа, якую ствараю, існуе ў адным экзэмпляры. Люблю работы, якія прыносяць карысць, могуць служыць чалавеку. Напрыклад, адна жанчына набыла кошык, каб складаць туды ўсю сваю касметыку. Вы не ўяўляеце, наколькі гэта зручна. Мы жывём у такі час, калі замест шаф усюды паліцы. Каб усё прыбраць з іх, каб не было захламленасці, людзі ставяць плеценыя кошыкі. І як мяняецца інтэр'ер!

Змяніліся і адносіны да майстроў. Вольга Міхайлаўна згадала, як на адной з выставак мужчына ўпадабаў адну з работ. Вось толькі цэны яму падаліся высокімі. Жанчына паказала яму свае рукі, спрэс пакалатыя саломкай. І чалавек адразу забраў выраб.



— Не мае значэння, ці гэта салома, пэчварк, ткацтва. Кожную справу трэба рабіць з добрым настроем. У яе чалавек укладвае і сваё цярпенне, і сваю душу, — заўважае Вольга Міхайлаўна. — Цяпер мы працуем у няпростых умовах. Многія функцыі Цэнтра рамёстваў завязаныя на выкананні платных паслуг. Вельмі хочацца, каб было больш часу на творчасць і пошукі. Каб можна было паехаць на раён, пагаварыць з людзьмі, якія яшчэ засталіся па вёсках, сабраць апошні матэрыял. Навагрудскай зямлі ёсць чым пахваліцца. Вельмі радуе тое, колькі ў краіне робіцца для захавання рамёстваў. 20 гадоў стабільнасці дазволілі нам зрабіць вельмі многае. Мы пачыналі работу з двух сталоў. Сёння ў нас шыкоўны Цэнтр, запаснікі. Ёсць што паказаць дзеткам. Хочацца, каб усё тое, што мы распачыналі, захавалася і прымнажалася, не пайшло ў заняпад. Таму для дзяцей, якія прыходзяць да нас на экскурсіі, мы стараемся стварыць адмысловую атмасферу. Мы ім распавядаем не толькі пра рамёствы, а і пра святы, абрады, загадваем загадкі, расказваем прыказкі і прымаўкі. Яны гуляюць у тыя гульні, якія былі ў нас на Калядах, Вялікадні, Масленіцы. Праводзім флэшмобы на вуліцы, ездзім у летнія лагеры. Вельмі перашкаджае каранавірус, да пандэміі ў нас заўсёды было шмат гасцей, аўтобусам недзе было стаць.

## Захавальнікі традыцый

Навагрудскі раённы цэнтр рамёстваў працуе ўжо 22-і год. Тут адраджаюцца традыцыі саломапляцення, аплікацыі з саломкі, ручнога ткацтва, пляцення паясоў, абрэзкавага шыцця, кавальства, вязання, бондарства, роспісу, вышыўкі, інкрустацыі бяростай. З мэтай падтрымкі народных умельцаў і развіцця пры Цэнтры рамёстваў працуюць 13 клубных фарміраванняў, у тым ліку і народны клуб майстроў народнай творчасці «Каляровая альтанка». Прывезена багата дыпломаў з разнастайных конкурсаў. Майстры актыўна ўдзельнічаюць у рэспубліканскіх і абласных святах, фестывалях, выставах.

— Калі мне было 16 гадоў, я ўсё перажывала, што ж я буду рабіць на пенсіі. А яшчэ ні дня на ёй не была, — смяецца Любоў Завольская. За яе плячыма больш за 40 гадоў работы на быткамбінаце і ў сферы адукацыі. А з 2015 года яна прыйшла ў Цэнтр рамёстваў, аднавіла ткацтва, пляценне паясоў на дошчачках, робіць нацыянальныя строі, вучыць рамёствам дзяцей і дарослых.

Таісію Крупіцу мне прадстаўляюць як аднаго з самых актыўных «баявых таварышаў» «Каляровай альтанкі»: «Яна з намі і ў дождж, і ў снег, і ў буру ездзіць на ўсе выставы, і на Александрыю, і на Славянскі базар, фестываль нацкультур, на Дажынках у холад з тэрмасам стаяла. Заўсёды падтрымае ўсмешкай».

— Сюды цягне. Гэта супадзенне поглядаў, настрояў і інтарэсаў, — прызнаецца Таісія Сямёнаўна. Яна самастойна навучылася вязаць кручком. І стварае такія рэчы, за якімі б зараз ганяліся дызайнеры, а аб яе карункавых парасонах марыла б кожная прыгажуня. У свае «за 70» Таісія Сямёнаўна актыўна пераймае ў Цэнтры новыя веды, выкладвае абразы з бісеру, захапілася шыццём са шматкоў.

Калі вы пабываеце ў Навагрудскім цэнтры рамёстваў, адчуеце, што тутэйшыя майстры здольныя чараваць над самымі рознымі праектамі: яны могуць стварыць незвычайныя прадметы інтэр'еру, упрыгажэнні, дызайнерскія рэчы. Можа, таму, што працуюць зладжаным калектывам, дзеляцца сваімі ідэямі і талентамі. Іна Анікевіч умее з кавалкаў тканіны вырабляць карціны, пано, дыванкі, цацкі, торбачкі. Яе пано ў тэхніцы абрэзкавага шыцця «Матывы роднай Беларусі» ўпрыгожвае «Палатно-абярэг «Дыван сяброўства», якое з'яўляецца сімвалам Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур.

Цэнтр стаў кропкай прыцягнення для маладых творцаў, сюды яны ідуць са сваімі ўменнямі і набіраюцца ведаў і вопыту побач са старэйшымі калегамі.

Дзяўчаты, якія шчыруюць над аўтарскімі лялькамі, аздабляюць іх элементамі з выкарыстаннем традыцыйных тэхнік. Так, майстар дэкаратыўна-прыкладной творчасці народнага калектыву «Каляровая альтанка» Вольга Крако пераняла вопыт ткацтва паясоў, і яе аўтарскія конікі займелі незвычайныя папружкі. Сёння яна працуе над калекцыяй лялек у народных касцюмах.

Тут вы сустрэнеце майстроў на ўсе рукі, яны ўмеюць працаваць з рознымі матэрыяламі. Алена Шульга займаецца саломапляценнем, аплікацыяй, роспісам па дрэве і шкле, стварае вырабы з гіпсу і халоднага фарфору ды іншае. Сучаснаму майстру без такога набору ўменняў не абысціся.

— Часам я пачынаю працаваць без эскіза — не ведаю, што можа атрымацца, і нават не растлумачу, якая сіла мной кіруе, — прызнаецца Алена, калі дэманструе калекцыю сваіх лялек. Вы нідзе не знойдзеце падобных.

Кацярына Сіневіч знаёміць са сваёй калекцыяй галаўных убораў, дэталі на кожным з якіх падбіраліся пад розныя народныя святы...

Наогул, пра навагрудскіх чараўнікоў можна распавядаць доўга. Толькі ў клубе «Каляровая альтанка» 28 майстроў, а колькі ў іх таленавітых сяброў! У вёсках нараджаюцца незвычайныя карціны, ствараюцца абразы, лялькі, музычныя інструменты. Многія хаты нагадваюць сапраўдныя музеі народнага мастацтва...

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# АПРАМЕТНАЯ ВАСІЛЯ ШАШАЛЕВІЧА

## Для адной яго п'есы таемна пазычылі ўпрыгажэнні Шаляпіна, з-за другой аўтара кінулі ў вогнішча

1916 год. Яраслаўль. Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй.

Тут вучацца два юнакі, якія ўвойдуць у гісторыю беларускай літаратуры — Васіль Шашалевіч, сын пісара, і Максім Багдановіч, сын настаўніка. Абодвух яднае любоў да роднай Беларусі.

Васіль Шашалевіч не закончыць вучобу — не хопіць сродкаў. Максім, адпраўлены ў ліцэй воляю бацькі, паедзе ў Мінск, адтуль — у Ялту, дзе памрэ...

Абодва хвараюць на сухоты. Васілю лёс адмерае на два дзясяткі гадоў больш за Максіма. Але ён таксама памрэ на чужыне.

### Незвычайная сям'я

Удакладніць моманты біяграфіі Васіля Шашалевіча нам дапамогуць дакументы з Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва. Там захоўваецца ліст сястры Васіля Ксеніі ад 21.02.1958 года, у якім яна дасылае звесткі аб браце.

*«В.А.Шашалевич родился 1-го января 1897 г. ст.ст. в селе Мхиничи Могилевской губ. Чериковского уезда в семье волостного писаря 4-м ребенком. Отец умер от туберкулёза, когда мальчику было 4 года»*

Ужо ёсць пра што паразважаць, бо паўсюль значыцца, што Васіль Шашалевіч нарадзіўся 9 студзеня. Сястра памылілася? Яшчэ пішуць, што калі бацька памёр, Васілю было 9 гадоў. Зноў несупадзенне.

*«Страшно нуждаясь, мать стремилась дать детям учительское образование. Сельскую школу мальчик окончил в д. Палужи 1908 г. Затем учился в духовном училище и духовной семинарии в г. Могилеве по настоянию матери... В войне по слабости здоровья (лёгкие) не участвовал, у белых не был. Был зачислен в Ярославский юридический лицей, но не учился там из-за материальных затруднений. Давал частные уроки по музыке и рус. яз. В 1917 г. поступил учителем начальной школы в дер. Ясенка Краснопольской волости».*

Разам з Васілём настаўнічаюць яго брат Андрэй — ён праславіцца пасля пад псеўданімам Андрэй Мрый, сёстры Наста і Ксенія. Сяргей Грахоўскі ўспамінаў: *«Шашалевічы стварылі першы ў раёне драматычны тэатр, у школе арганізавалі драматычны і літаратурны гурткі, выдавалі рукапісны часопіс «Пралеска». Сатырычны раздзел у ім вёў Андрэй Шашалевіч. Яны ставілі спектаклі па п'есах Астроўскага, Горкага, Чэхава для школьнай самадзейнасці, пісалі аднаактоўкі, там жа Васіль Антонавіч пачаў пісаць сваю славутую «Апраметную».*

Дарэчы, дэкарацыі да спектакляў тэатра Шашалевічаў робіць яшчэ адзін выкладчык з Краснаполля, настаўнік прыродазнаўства і малявання Аляксандр Грубэ, які зробіцца мужам адной з сясцёр, будучы старшыня Саюза мастакоў БССР і народны мастак.

Ксенія Шашалевіч дапаўняе:

*«В 1924 г. он едет жить и работать в Минск учителем нач. школы и 5-7 классов.*

*Одновременно писал.*

*С раннего детства он много читал.*

*В школе отличался своими сочинениями, его сочинения всегда зачитывались в классе, особенно помню его сочинение «Смерть отца» из воспоминаний детства.*



*Первое его произведение было в 15 лет «Рамафаим-Цофим», где он вывел преподавателя истории — чахоточного учителя, с большой жаждой жить, и, наперекор этому, покончившего жизнь самоубийством».*

Удакладнім, што таямнічы Рамафаім-Цафім — гэта біблейскі горад, які згадваецца ў Першай кнізе Царстваў, радзіма бацькі прарока Самуіла. Зразумела, для навучэнца духоўнай вучэльні за гэтым шмат алюзій.

*«В Минске В.А. показывает свое произведение Янке Купале «Зруйнаваная цемра» — сказка-феерия в стихах, которая получила высокую оценку со стороны Янки Купалы. Эта вещь была напечатана в газете «Совецкая Беларусь» в янв. или февр. 1925 г. В 1925 г. эта вещь репетировалась Белгостеатром в Москве, но когда ставилась — не помню, не знаю... Драма «Волчьи ночи» была поставлена во 2-м бел. театре в Минске в 1926 г., в октябре-ноябре. Успех был огромный. С 1928-го он целиком посвятил себя творчеству».*

### Дыяменты Шаляпіна

У архіве захоўваюцца запісы ўспамінаў удзельнікаў спектакля «Апраметная», першая назва — «Зруйнаваная цемра». Гэта тая самая п'еса, якую Шашалевіч паказваў Янку Купалу. Успаміны збіраў тэатразнавец Алег Саннікаў, сын аднаго з тых артыстаў, Канстанціна Саннікава.

Вось расповед Алены Радзялоўскай ад 13 снежня 1970 года, Віцебск:

*«Я плохо помню уже содержание спектакля. Его готовили в Москве, хотели везти в Париж. Помню, что у Ведьмака в «Апраметнай» был цилиндр, а начинался спектакль с Лирника, которого играл Молчанов...*

*Мы все очень готовились к этому спектаклю. Тогда были тренированными, изучали биомеханику. На сцене были натянуты тросы — паутина, лазили по всей сцене по тросам. На руки одевали такие рабочие брезентовые рукавицы, чтобы не уколоться о проволоку тросов.*

*Для этого спектакля учились ходить по проволоке, Молчанов был лучший ходок».*

Удакладнім наступным расповедам Таццяны Бандарчук (запісана 22 студзеня 1971 г., Бабруйск):

*«История «Апраметнай» такая — СССР пригласили участвовать в международной музыкальной выставке в Париже. На Украине нашли молодую певицу Петренко, а из Белоруссии никого не было. Кто-то подал мысль, что в Москве учатся. Ну вот и начали готовить этот спектакль с расчетом на выступление в Париже».*

«Учатся» — гэта пра Беларускую драматычную студыю, якая працавала пры Маскоўскім мастацкім акадэмічным тэатры. Выпускнікі гэтай студыі склалі пасля аснову БДТ-2, які пачне працаваць у Віцебску.

*«Ставил спектакль «Апраметная» муж Ирины Федоровны Шаляпиной Пашков. И жил он у них в доме (Шаляпину ведь оставили дом на Новинском бульваре. Санников ходил туда играть в бильярд)...*

*С моей ролью случилось что: Черная Лилея «во всем голом» — в трико, одежды немного. Нужны были украшения, драгоценности. А в Москве не достать, хоть и НЭП был в то время. Бегала я по базарам, ничего не могу найти. Пашков говорит: «Ладно, я вам принесу». И на сдачу, на спектакль он принес, отпорол от Шаляпинского костюма — не то Бориса Годунова, не то еще какого-то. Дает мне и говорит: «Вы головой не ответите, а я отвечу». Я отыграла спектакль и вернула ему».*

Агучвае Таццяна Бандарчук і версію, чаму спектакль у хуткім часе забаранілі: нібы з-за эпізоду, калі Вядзьмак адбірае мову ў рыцараў, якія ідуць выручаць Алёнку, і змушае іх брахаць па-сабачы. І ў Парыжы п'есу Шашалевіча не паказалі: палічылі дарагім везці трупу, і запрасілі замест гэтага спявачку Ірму Яўнзем.

### Гульня ў пратаколы

Давайце пагартаем таўшчэзную папку, дзе сабраныя пратаколы пасяджэнняў рэвізійнай камісіі Таварыства дрампісьменнікаў.

*«Паводле пастановы ад 03.12.1930 пр. 45, параграф 396 са складу членаў Т-ва выключаны заарыштаваныя АДПУ ў звязку з выкрыццём контррэвалюцыйнай групы бел.нацдэмаў».*

Сярод выключаных — Васіль Шашалевіч. Ён быў арыштаваны сярод многіх па сфальсіфікаванай справе «Саюза вызвалення Беларусі».

Але праз год быў вызвалены. Гартаем папку з пратаколамі далей: разглядалі заяву В. Шашалевіча аб аднаўленні яго ў членстве.

*«Пастанавілі: Выклікаць В.Шашалевіча на наступнае паседжанне пр-ня, прасіць інфармаваць аб сваёй апошняй працы, каб на падставе яе мець пагляд аб сучаснай асобе Шашалевіча, паводле якога (пагляду) і ставіць на агульным сходзе пытанне пра яго аднаўленне ў Т-ве».*

Васіль Шашалевіч быў аднаўлены 20 сакавіка 1932 года.

Пагартаем яшчэ адну грувасткую таміну — пратаколы дыспутаў і абмеркаванняў спектакляў Беларускага Першага дзяржаўнага тэатра Наркама асветы БССР за час ад 3 кастрычніка 1934 года да 13 студзеня 1935 года.

У пратаколе праглядавай рэпетыцыі спектакля па п'есе Васіля Шашалевіча «Сімфонія гневу» ад 3 кастрычніка 1934 года шмат пярчынак:

*«Литвинов: Видно, что все время билась мысль, как же играть людей Запада. Чтобы они не походили на иностранцев из Койданово».*

*«Владомирский: Неясно-психологический рисунок Анели. Девочка романтически настроенная, несколько истеричная.*

*Данилов: Мы хотели сделать нео-Гретхен».*



**Андрэй Мрый, яго жонка Соф'я Зыкава, пляменніца Нона Грубэ, брат Васіль Шашалевіч, сястра Ксенія, 1928 г.**

*«Автор пьесы Шашалевич: «Хуже всех сцен это сцена подполья. Меня прямо в пот прошибло. Ужасно. Надо будет написать новую сцену, так это оставить нельзя. Это какая-то сатира на подполье. Какая-то вечеринка фокстротного порядка. Люди совсем не думают о революции».*

П'еса «Сімфонія гневу» была дужа актуальнай — пра змаганне супраць фашызму, які нараджаўся ў Еўропе. Але пратакол нарады пасля рэпэтыцыі п'есы «Сімфонія гневу» ад 30 снежня 1934 года пачынаецца змрочна:

*«Покровский. Наш разговор сегодня будет носить несколько конфиденциальный характер. Дело в том, что вокруг показанного нам сегодня будущего спектакля пошли разговоры о прекращении работы над ним, о невозможности работать с этим материалом и т.д... Существует мнение, что пьеса настолько плохая, что театр в ней не сумеет показать своих качеств, что постановка потянет театр назад».*

Зразумела, нікому не хацелася адмаўляцца ад ужо гатовага спектаклю. Таму ўсё валілі на драматурга: і тое ў п'есе не так, і гэтае... Але тэма патрэбная, а тэатр зрабіў усё, што мог, каб «выратаваць матэрыял». Заключэнне: на пару тыдняў спектакль законсерваваць, потым дапрацаваць, паляпшаючы п'есу «до потолка».

З пазнейшых выказванняў Васіля Шашалевіча можна зразумець, што яму сярод іншага «выставілі катэгарычнае патрабаванне вывесці двух—трох камуністаў».

«Мой вораг без ліку і без твару. Мой вораг — эпоха. З музыкі я сам сабе стварыў Галгофу, і эпоха мяне на ёй раскрыжавала», — гаворыць у п'есе кампазітар Сальк, які адмаўляецца супрацоўнічаць з фашыстамі.

Спектакль выйшаў, меў поспех. І якраз прыдаўся ў якасці мішэні для кампаніі супраць фармалізму.

Аўтар быў арыштаваны 28 кастрычніка 1936 года.

### Апошнія колы пекла

Калі Васіля Шашалевіча арыштавалі, ён меў сям'ю. Жонка, Вера Сямёнаўна Пушкевіч, «беленькая, негаваркая», сын Генрых, названы ў гонар Генрыха Гейнэ.

Пра тое жахлівае, што было пасля арышту, мне ўжо даводзілася пісаць... Згадаем цяпер хіба тое-сёе. Напрыклад, выпадак, калі следчы, які дапытваў Шашалевіча, у якасці ўзору, як трэба пісаць, прывёў убачаную нядаўна п'есу супраць фашызму. Шашалевіч растлумачыў, што гэта і ёсць яго п'еса «Сімфонія гневу».

Асуджаны на дзесяць гадоў лагераў Васіль Шашалевіч у зняволенні зусім расхварэўся — спадчынныя сухоты... У Томсінлагу напісаў вясёлую п'есу з лагернага жыцця, якую паставілі сіламі зэкаў. Кіраўніцтва лагера палічыла нешта абразай у свой бок. Хворага Шашалевіча адправілі валіць лес... Усё, на што ён быў здатны, — сядзець каля вогнішча і запісваць на фанерцы нормы. Нехта адмыслова зваліў на яго цяжкую бярозу, Васіля адкінула проста ў вогнішча. Пакуль дасталі — абгарэў так, што выцеклі вочы. У санчастку прывезлі толькі ўвечары, дзе аўтар «Сімфоніі гневу» і сканаў.

Жонка, Вера Сямёнаўна, доўга не ведала пра смерць мужа. Калі ў 1956-м знайшла на радыё рэабілітаванага Сяргея Грахоўскага, той не наважыўся распавядаць падрабязнасці. Але дамогся, каб Саюз пісьменнікаў выпісаў удаве таксама рэабілітаванага Васіля Шашалевіча кампенсацыю за смерць мужа — тысячу рублёў. Вера Сямёнаўна разам з сынам Генрыхам, які на той час быў у арміі, жылі ў вёсцы Волма Дзяржынскага раёна, здымалі кут у вясковага п'яніцы Міхаіла Крыловіча. Кампенсацыю выслалі па пошце... Пайшлі чуткі пра невераготныя грошы. Калі Вера Сямёнаўна нешта гатавала ў печы, Крыловіч ударыў яе сякерай па галаве. Але знайшоў толькі новую зберагальную кніжку, працверазеў, павесіўся.

Генрых Шашалевіч вярнуўся з арміі, змяніў імя на Генадзь і пераехаў у Мінск, працаваў электрыкам.

Брат Васіля, Андрэй Мрый, у 1943 годзе, адпраўлены з Усць-Вымскага лагера дадому паміраць, быў забіты ў цягніку.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Практическая Механика» (УНП 192071634, г. Минск, ул. Чапаева, д. 3, каб. 322), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

***Дата и время проведения торгов:* 29 апреля 2022 года**.

Начало – 10.00. Заявки принимаются с 29 марта 2022 года по 27 апреля 2022 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Практическая Механика» (УНП 192071634)** в лице антикризисного управляющего – индивидуального предпринимателя Воронец Анастасии Анатольевны, тел. 8 (029) 570-39-28.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, рублей без учета НДС | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Грузовой автомобиль VOLKSWAGEN TRANSPORTER, гос. № АС 7314-7, 2008 г. в., кузов № WV1ZZZ7HZ8H166385, ТП № MAA2260803 | 13 000,00 | 5 % | 10 % |

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок до 16.00 **27 апреля 2022 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 16.00 27.04.2022 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41.

Контактное лицо для осмотра лота: Яскевич Дмитрий Васильевич, тел. 8 (029) 684-71-76.

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 10 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 15 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Республиканского дочернего унитарного предприятия по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт» (продавец) извещает о проведении 20 апреля 2022 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование лотов | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %) | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Часть здания (помещение мойки) площадью 124,6 кв. м в капитальном строении** с инв. № 350/С–54108 – автозаправочная станция, магазин; назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции). **Часть сооружения (покрытие) площадью 93,0 кв. м** – асфальтобетонное покрытие стоянки автомобилей. **Местонахождение:** г. Гомель, ул. Барыкина, 271. Арендная плата в месяц – **104,5** базовой арендной величины. Коэффициент спроса – **3,0**. Базовая ставка – **0,3**. Коэффициент местоположения – **0,7**. **Цель использования:** для обслуживания автомобилей. **Срок аренды – 1 год (с возможностью продления по соглашению сторон)** | **636,28** | **636,28** |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце** | Республиканское дочернее унитарное предприятие по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт», 247012, пос. Янтарный, 12, Поколюбичский с/с. **Порядок ознакомления с имуществом и заключения договора аренды осуществляется по контактному тел. 8 (029) 657-23-51 – Владислав Валерьевич; 8 (0232) 92-49-46 – Лариса Ивановна** |
| **Срок подачи заявления** | **С 29.03.2022 г. по 18.04.2022 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга». Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Расчетный счет **Продавца (РДУП по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт»):** р/с BY82 BLBB 3012 0490 3217 3000 1001 в ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 490321730, **назначение платежа** – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления) |
| **Размер штрафа** | Лот № 1 – 5 (пять) базовых величин, согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству) |

